

ПОШУК ВЕЧНАГА ЖЫЦЦЯ

5

СЦЕЖКАМІ ПАЛЕШУКОЎ

20–21



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЖНІЎНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 149 (29518)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Цяжка акумуляваць вялікі аб'ём сродкаў і будаўнічых работ у пэўным райцэнтры, а «Дажынкі» дапамагаюць зрабіць гэта. Усё, што робіцца ў райцэнтрах да «Дажынак», застаецца тут на доўгія гады. Школы, садкі, установы культуры, добраўпарадкаванне паркаў і алей, абноўленыя вуліцы і дарогі. Усё гэта робіцца для таго, каб наблізіць узровень жыцця райцэнтраў да гарадскіх і ўтрымаць моладзь, сем'і ў перспектыўных населеных пунктах».*

З першых вуснаў

# «НАРОД НАШ ПАВІНЕН АДЧУВАЦЬ СЯБЕ СПАКОЙНА»

## Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях сітуацыі на граніцы

**«Апошнія падзеі на нашых граніцах з Літвой і Латвіяй сама меней насцярожваюць. Не столькі з Латвіяй, колькі з Літвой і нават Польшчай. Думаю, што калі супаставіць усе фактары і факты, якія мы назіраем апошнім часам, прайшоўшы там сем ці восем этапаў «каляровай рэвалюцыі», у іх у плане нічога не засталося. Таму вярнуліся да даўно апрабаванай тактыкі — тактыкі шантажу, ціску і нават сілавых пагроз. Чаго вартыя іх пагрозы аб тым, што яны нібыта будуць канцэнтраваць нелегальных мігрантаў на пунктах пропуску па некалькі соцень, а можа быць, нават і тысячу чалавек і пад пагрозай зброі выціскаць на тэрыторыю Беларусі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на заканадаўства. І адзначыў, што абарона дзяржаўнай граніцы ў гэтым выпадку можа прывесці да канфлікту. Кіраўнік краіны зрабіў акцэнт на тым, што нельга дапусціць парушэння Дзяржаўнай граніцы, асабліва ў такой вельмі небяспечнай абстаноўцы, якая цяпер складваецца. «Але сказаць, што мы не прадбачылі гэта і не думалі, будзе няправільна. Мы ў свой час (і я перш за ўсё) вас арыентаваў на тое, каб вы былі вельмі ўважлівыя ў гэтым плане да нашых «сяброў-таварышаў» — суседзяў, асаблівa на Захадзе», — канстатаваў ён.

### «Закрыйце кожны метр граніцы»

Прэзідэнт папрасіў дзяржсакратара Савета Бяспекі Аляксандра Вальфовіча, якому напярэдадні было даручана абагульніць матэрыялы, выказаць сваё меркаванне аб сітуацыі на заходнім напрамку. А старшыню Дзяржпагранкамітэта Анатоля Лапо — далажыць аб магчымасцях Беларусі на гэтую сітуацыю.

«Тое, што яны там прынялі закон страляць у мігрантаў, біць, душыць, цкаваць, — мярзотнікі поўныя, але гэта ж іх правы. Яны паказалі сваё аблічча. Нас тут павінны турбаваць перш за ўсё апошнія метры нашай граніцы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

***Галоўнае даручэнне — узмацніць работу па ахове Дзяржаўнай граніцы і прадухіленні фактаў яе парушэння.***

«З сённяшняга дня ні адна нага на тэрыторыю Беларусі з сумежнага боку, няхай гэта будзе з поўдня ці з захаду, ступіць не павінна. Як вы будзеце гэта рабіць — вось пасля дадзенай нарады абмяркуем, — збярэцеся ў дзяржсакратара. Тут міністр МУС, міністр абароны. Закрыйце кожны метр граніцы. Мы нездарма ўкладвалі каласальныя сродкі ў пагранічныя войскі, у нашы наогул сілавыя структуры. Народ наш павінен адчуваць сябе спакойна, ён павінен ведаць, што ёсць мужыкі, якія гатовыя іх абараніць. Вось гэта мы павінны зрабіць», — заявіў беларускі лідар.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **Больш за дзевяць тысяч маладых спецыялістаў прыступіла да работы ва ўстановах аховы здароўя са жніўня.**
- «Віцязь» запусціў лінію па выпуску тэлевізараў вялікіх дыяганаляў і рыхтуе праект з расійскім Сбербанкам.
- **Колькасць выдадзеных у Беларусі найменняў кніг у 2021 годзе вырасла амаль на 20 %.**
- Дэпазіты фізічных асоб у II квартале 2021 года знізіліся на 9,5 % — да Br15,03 млрд.
- **Венесуэла з 1 кастрычніка ўвядзе лічбавую нацыянальную валюту.**
- У Гродне работнікі СТА ўкралі ў кліента каля 5,5 тысяч еўра і больш за $5 тысяч.
- **Жыхарка Вілейкі трапіла на фішынгавы сайт банка і пазбавілася 2,7 тысячы рублёў.**
- У Маладзечанскім раёне ў бутлегераў канфіскавалі амаль 2 тоны брагі.

Алімпійскі дзённік

# УСЕ КОЛЕРЫ ГУЛЬНЯЎ

TOKYO 2020



Фота БелТА.

**У медальнай скарбонцы беларускай каманды — поўны камплект. Сярэбраны медаль Алімпійскіх гульняў заваявала Ірына Курачкіна! У фінале спаборніцтваў па жаночай барацьбе яна ўступіла японцы Рысака Каваі. З паспяховым выступленнем Ірыну павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «Ты ўпэўнена ішла да алімпійскага поспеху, вяртаючыся з медалямі з кожнага буйнога турніру. І на такійскім дыване прадэманстравала высокае тэхнічнае майстэрства, уменне трымаць сябе ў руках, цярпецъ і выдатную фізічную падрыхтоўку, — гаворыцца ў віншаванні. — Дзякуй табе і тваім настаўнікам ад усіх балельшчыкаў за гэта «серабро» і пазітыўныя эмоцыі».**

**Аляксандр Лукашэнка пажадаў Ірыне Курачкінай моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.**

СТАР. 3

Рэгіёны

# Першая цаглінка

## Новыя кадры ў камандзе будаўнікоў Гомельшчыны

**Тут звыш пяцісот выпускнікоў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі атрымалі свае першыя працоўныя месцы ў будаўнічых арганізацыях. На прадпрыемствы рэгіёна размеркаваныя і маладыя спецыялісты з дыпломамі ВНУ: інжынеры-будаўнікі, геадэзісты, спецыялісты аддзелаў тэхнічнага кантролю і інжынеры-электронікі.**

Значная колькасць спецыялістаў сваё першае рабочае месца знайшла на Гомельскім домабудаўнічым камбінаце. Прадпрыемства само ўзводзіць жылыя дамы, з'яўляецца галоўным падрадчыкам іх узвядзення ў абласным цэнтры, забяспечвае поўны цыкл — ад вытворчасці буйнапанэльнага домабудавання да мантажу, адстройвання і рэалізацыі жылля. Усё гэта стабільна забяспечвае працай моладзь. Яе ва ўрачыстай атмасферы прадстаўляюць перад усім калектывам камбіната: напярэдадні Дня будаўніка, які прыпадае на другую нядзелю жніўня, праходзіць пасвячэнне «навабранцаў» — 13 выпускнікоў ВНУ і 8 — з дыпломамі ўстаноў прафтэхадукацыі. Ёсць на камбінаце і яшчэ адна традыцыя — разам з першай працоўнай кніжкай уручаць маладым спецыялістам гадзіннік з лагатыпам прадпрыемства. Гэта сімвал таго, што цяпер для прынятага члена калектыву пойдзе адлік новага часу жыцця.

**Гамяльчанка Анастасія РУБАНАВА** — адна з трох дзяўчат, якія атрымалі размеркаванне на Гомельскі домабудаўнічы камбінат пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту:

— Я адвучылася чатыры гады на факультэце «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», мая спецыяльнасць — інжынер-будаўнік, спецыялізацыя — арганізацыя і кіраванне будаўніцтвам будынкаў і збудаванняў.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

# «НАРОД НАШ ПАВІНЕН АДЧУВАЦЬ СЯБЕ СПАКОЙНА»

### «Для нас гэта дадатковая пагроза»

Па словах кіраўніка дзяржавы, не дай бог сумежныя краіны пачнуць рэалізоўваць тактыку выpraваджэння нелегальных мігрантаў праз афіцыйныя прапускныя пункты. «Вы ведаеце наступствы, яны — таксама. Таму няхай думаюць. Мы іх папярэдзілі, а яны няхай думаюць. Мяч на іх баку. Але дайсці да таго, каб забіваць людзей і напаўжывых выкідваць на нашу тэрыторыю... Ну нацысты і ўсё, што пра іх казаць», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што на нарадзе прысутнічаюць кіраўнікі практычна ўсіх асноўных сілавых структур. Таму важная тэма сустрэчы — пытанне аб тым, што адбываецца вакол Беларусі, і перш за ўсё палітыка Паўночнаатлантычнага блока НАТА.

«У гэтым кантэксце вельмі важна пачуць ваш пункт гледжання аб пазіцыі брацкай нам Украіны. Народ — блізкі, народ — родны, але кіраўніцтва Украіны, праводзячы антынародны курс там, узяло арыентацыю канфрантацыі. Мы не кажам, куды яны ідуць: на Захад, на Усход, на Поўдзень. Няважна. Гэта іх справа — вызначацца. Але ў аснове іх палітыкі ляжыць канфрантацыя. Для нас гэта дадатковая пагроза, якіх мы не мелі раней», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «ТРЭБА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ»

**Пасля нарады аб сітуацыі на граніцы Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаілам Ордам. Галоўныя тэмы сустрэчы — стварэнне пярвічных прафсаюзных арганізацый у прыватных структурах, рэакцыя прафсаюзаў на санкцыйную палітыку і садзейнічанне правядзенню ўборачнай кампаніі.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што пытанне аб стварэнні пярвічных прафсаюзных арганізацый у прыватным сектары ўзнімалася неаднаразова. Ён нават назваў гэтае пытанне балючым. «Калі да гэтага часу ёсць яшчэ асобныя, што не зразумелі, значыць, трэба ва ўрадзе неадкладна абмеркаваць гэтыя пытанні і ўнесці канкрэтныя прапановы аж да ліквідацыі прыватных структур, якія адмаўляюцца мець прафсаюзныя арганізацыі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі за рэакцыю на санкцыйны ціск. «Гэта дастойная работа, калі арганізавалі людзей, і ў міжнародным плане быў пачуты голас не толькі лідараў прафсаюзаў, а нашых людзей, працоўных. Малайцы. Тысячы і тысячы людзей, якія вырашылі выказацца. Гэта вялікая справа, — заўважыў ён. Беларускі лідар выказаў думку, што такая маштабная рэакцыя людзей у адказ на санкцыі абавязкова дасць вынік.

Міхаіл Орда запэўніў кіраўніка дзяржавы, што прафсаюзы працавалі і будуць працаваць над тым, каб процідзейнічаць і супрацьстаяць гэтым недружалюбным і варожым дзеянням.

Аляксандр Лукашэнка і Міхаіл Орда абмеркавалі ўборачную кампанію і ўдзел прафсаюзаў у ёй. «Санкцыі санкцыямі, але калі будзе ў што адзець дзяцей да школы і людзям адзецца нармальна, калі будзе што паесці людзям, тады будзе вынік», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што ўборачная кампанія ў Беларусі традыцыйна праходзіць у асаблівых умовах надвор'я, і прафсаюзам трэба аказаць аграрыям неабходнае садзейнічанне, як гэта бывае кожны год. «У жніўні заўсёды час спрэсаваны, і надвор'е нас правярае на цвёрдасць і рашучасць. Трэба забяспечыць людзей. Перш за ўсё — зарплата, харчаванне ў полі і гэтак далей, звычайная работа прафсаюзаў», — паставіў задачу Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Бяспека

# Трымаць порах сухім

### Вучэнне «Захад-2021», якое пройдзе з 10 да 16 верасня, мае выключна абарончы характар

**Сумеснае стратэгічнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі перш за ўсё накіравана на павышэнне навучанасці войскаў са складу рэгіянальнай групоўкі, прызначанай для забеспячэння бяспекі ва Усходне-еўрапейскім рэгіёне. Аб гэтым падчас брыфінгу для прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі і ваенна-дыпламатычнага корпуса заявіў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Віктар ГУЛЕВІЧ.**

— Падрыхтоўка да вучэння адбываецца ва ўмовах няпростай ваенна-палітычнай абстаноўкі ў свеце ў цэлым і ў еўрапейскім рэгіёне ў прыватнасці, — адзначыў першы намеснік кіраўніка абароннага ведамства. — На фоне ваенных канфліктаў, якія не патухаюць і зноў узгараюцца ў шматлікіх кутках планеты, Рэспубліка Беларусь імкнецца да мінімізацыі ўзнікнення ваенных пагроз на Усходняй Еўропе і прыкладае максімум намаганняў для зніжэння напружанасці ў рэгіёне, праводзіць міралюбівую і адкрытую палітыку.

Задачы, пастаўленыя ў вучэнні, будуць ажыццёўлены як на чатырох беларускіх, так і на дзевяці расійскіх палігонах. У манеўрах, якія адбудуцца на нашай тэрыторыі, возьме ўдзел каля 12 800 ваеннаслужачых: сярод іх 2,5 тысячы расійскіх і да 50 казахскіх вайскоўцаў са складу Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Акрамя таго, у вучэнні будзе задзейнічана каля 350 адзінак бранятанкавай тэхнікі, да 110 адзінак артылерыі і рэактыўных сістэм залпавага агню, звыш 30 самалётаў і верталётаў.

Як падкрэсліў Віктар Гулевіч, сумеснае стратэгічнае вучэнне «Захад-2021» мае выключна абарончы характар, і яго правядзенне не нясе ніякай пагрозы ні для еўрапейскай супольнасці ў цэлым, ні для суседніх краін у прыватнасці. «Яно дазволіць на практыцы ўдасканаліць механізм сумеснага выкарыстання абаронча інфраструктуры і праверыць гатоўнасць і здольнасць рэгіянальнай групоўкі войскаў выконваць задачы па прызначэнні», — удакладніў генерал-маёр.

Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл акцэнтаваў увагу на тым, што на працягу апошніх некалькіх гадоў каля заходніх граніц Саюзнай дзяржавы створаны перадавыя камандныя цэнтры НАТА. «З канца 2020 года на тэрыторыі Польшчы пачала функцыянаваць перадавая аператыўная група штаба 5-га армейскага корпуса сухапутных войскаў ЗША, колькасць сіл першачарговага задзейнічання НАТА павялічана да 40 тысяч чалавек, — канстатаваў Віктар Гулевіч. — Чатыры шматнацыянальныя батальённыя тактычныя групы блока прыведзены ў поўную аператыўную гатоўнасць. Толькі замежныя воінскія кантынгенты, размешчаныя ў Польшчы і ў краінах Балтыі, налічваюць звыш 8,5 тысячы ваеннаслужачых, каля 120 танкаў, больш чым 230 баявых браніраваных машын, каля 70 артылерыйскіх сістэм і рэактыўных сістэм залпавага агню, а таксама звыш 30 баявых самалётаў і верталётаў. Паскоранымі тэмпамі ідзе рэалізацыя прынятай у 2018 годзе на саміце НАТА ініцыятывы ЗША «Чатыры па трыццаць», згодна з якой у распараджэнне кааліцыйнага камандавання аб'яднаных узброеных сіл блока павінны перадавацца да 30 агульнавайсковых батальёнаў, 30 авіяцыйных эскадрылляў і 30 баявых караблёў асноўных класаў, якія знаходзяцца ў 30-сутачнай гатоўнасці. Гэта дазволіць НАТА ў сукупнасці з сіламі першачарговага задзейнічання і чатырма баявымі брыгаднымі групамі ЗША ў кароткі тэрмін засярodзіць каля нашых граніц наземную групоўку колькасцю да 100 тысяч чалавек».

Падчас брыфінгу было заўважана, што актыўна ідзе ўдасканаленне аператыўнага абсталявання тэрыторый суседніх з нашай краінай дзяржаў, у тым ліку спецыяльных складскіх комплексаў для размяшчэння і тэхнічнага абслугоўвання ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, захоўвання запасаў матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, складзіравання боепрыпасаў у інтарэсах узброеных сіл ЗША. «У непасрэднай блізкасці ад Дзяржаўнай граніцы Беларусі з высокай інтэнсіўнасцю праводзяцца вучэнні НАТА, падчас якіх у тым ліку адпрацоўваюцца пытанні перакідання войскаў, падрыхтоўкі маршрутаў руху і раёнаў баявога прызначэння, стварэння груповак, навядзення пераправаў, фарсіравання водных перашкод, высадкі дэсантаў і многія іншыя задачы, характэрныя менавіта для вядзення наступальных дзеянняў», — паведаміў першы намеснік міністра абароны. — Мы аб'ектыўна разумеем, што правядзенне вучэнняў з'яўляецца адным з асноўных элементаў падрыхтоўкі войскаў. Аднак іх характар і інтэнсіўнасць, якая прагрэсіруе, не можа не выклікаць у нас занепакоенасці, асабліва пасля шэрагу правакацыйных дзеянняў з боку нашых заходніх суседзяў».

**Вераніка КАНЮТА.**

Шок

# «ЗА ШТО ЛІТОЎСКАЯ ПАЛІЦЫЯ АБО ПАГРАНІЧНІКІ ЗАБІЛІ НАШАГА БРАТА?»

## Зверствы літоўцаў працягваюцца

**«Мы прыляцелі сюды, каб даведацца, за што літоўская паліцыя або пагранічнікі забілі нашага брата. Ён быў без зброі. Ён не тэрарыст», — заявілі ўчора пасля прыбыцця ў Беларусь брат і дзядзька забітага літоўскімі пагранічнікамі 29-гадовага Джафара Хусэйна Юсюфа. Між тым, зверствы з літоўскага боку працягваюцца.**

Літва зноў прымушае мігрантаў парушаць беларускую граніцу. Пра гэта БелТА паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.** «Полацкія пагранічнікі ў поўдзень 4 жніўня зафіксавалі спробу агрэсіўнага выправаджвання васьмярых мігрантаў пяццю літоўскімі сілавікамі на тэрыторыю Беларусі. Аднак беларускія пагранічнікі не дапусцілі парушэння Дзяржаўнай граніцы. Праз некаторы час на сумежным баку аднаму з бежанцаў стала дрэнна. Ён неаднаразова вымавіў слова «інсулін» і жэстамі паказаў на боль у грудзях. Аднак прадстаўнікі літоўскага боку ніяк не адрэагавалі на просьбы мужчыны. Убачыўшы, што чалавеку патрэбная дапамога, беларускія пагранічнікі неадкладна выклікалі медыкаў», — распавёў Антон Бычкоўскі.

Паводле яго слоў, праз непрацяглы час на месца прыбыла брыгада хуткай медыцынскай дапамогі. «У гэты момант людзі ў літоўскай вайсковай форме пакінулі мігрантаў і з'ехалі, а замежнік, якому стала дрэнна, перайшоў на тэрыторыю Беларусі, дзе яму была аказана першасная медыцынская дапамога. Пасля мужчыну даставілі ў медыцынскую ўстанову», — дадалі ў ДПК.

Міжнародная супольнасць вельмі ўстрывожаная бесчалавечымі дзеяннямі Літвы. Упраўленне вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ) заявіла, што занепакоена паведамленнямі пра гвалт на літоўска-беларускай граніцы і заклікае Літву выконваць міжнародныя абавязацельствы, якія датычацца права на прыстанішча. Пра гэта заявілі ТАСС у жэнеўскай штаб-кватэры дадзенага ўпраўлення.

«Мы ўважліва сочым за сітуацыяй і яе развіццём», — адзначыла **афіцыйны прадстаўнік УВКБ Шабія МАНТУ.** «УВКБ заклікае Літву прытрымлівацца ўсіх міжнародных абавязацельстваў. Мы таксама асабліва занепакоеныя паведамленнямі пра гвалт у дачыненні да людзей на граніцы», — падкрэсліла яна.

Афіцыйны прадстаўнік растлумачыла, што Канвенцыя 1951 года аб статусе бежанцаў, Еўрапейская канвенцыя па правах чалавека і заканадаўства ЕС ясна патрабуюць ад дзяржаў забяспечыць права людзей на прыстанішча і абарону, нават калі яны прыбываюць у краіну незаконна. «Правы шукаць прыстанішча з'яўляецца фундаментальным чалавечым правам. І хоць у дзяржаў ёсць законнае права кантраляваць свае граніцы, яны павінны таксама выконваць правы чалавека», — канстатавала Шабія Манту.

Паводле яе слоў, улады не могуць аўтаматычна адмовіць ва ўездзе або вярнуць людзей, не правёўшы індывідуальнага разгляду ў дачыненні да тых, хто мае патрэбу ў абароне, паколькі гэта было б парушэннем міжнароднага права. «Акрамя таго, згодна з Канвенцыяй 1951 года аб статусе бежанцаў, нелегальны ўезд з мэтай пошуку прыстанішча не павінен падлягаць пакаранню», — заўважыла Шабія Манту.

**Намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргей Алейнік правёў сустрэчу з кіраўніком прадстаўніцтва Упраўлення вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі Мулусеу МАМА.** Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага знешнепалітычнага ведамства.

Сяргей Алейнік падрабязна праінфармаваў суразмоўніка аб развіцці сітуацыі на беларуска-літоўскай граніцы, спыніўся на абставінах і канкрэтных фактах трагічных падзей, якія мелі месца 3 і 4 жніўня, заявіў аб адкрытасці беларускага боку ў адносінах да расследавання, якое праводзіцца.

Намеснік міністра замежных спраў Беларусі таксама адзначыў непрымальнасць варварскіх метадаў гвалтоўнага выправаджэння шукальнікаў прыстанішча на тэрыторыю Беларусі ў парушэнне палажэнняў Канвенцыі аб статусе бежанцаў 1951 года і іншых адпаведных міжнародных дакументаў.

Сяргей Алейнік заклікаў УВКБ ААН садзейнічаць урэгуляванню сітуацыі і вяртанню літоўскага боку ў прававое поле. Суразмоўнікі выказалі сур'ёзную заклапочанасць сітуацыяй, якая склалася, асабліва фактамі гвалту ў дачыненні да людзей на граніцы, і адзначылі важнасць захавання міжнародных абавязацельстваў, якія датычацца права на прытулак.

Як стала вядома, на граніцу Літвы з Беларуссю па запрашэнні літоўскіх улад было накіравана каля 100 афіцэраў Еўрапейскай службы пагранічнай і берагавой аховы (Frontex) для дапамогі ў патруляванні — з-за рэзкага росту патоку мігрантаў з Азіі і Афрыкі. МУС Літвы абвясціла, што будуць адпраўляць мігрантаў назад у Беларусь. Гэта спрэчная тактыка, якую праваабаронцы называюць незаконнай і небяспечнай і шмат гадоў звязваюць з ёй еўрапейскія пагранслужбы, піша брытанская служба навін BBC. Frontex, як адзначаецца ў матэрыяле BBC, з'яўляецца сілавой структурай ЕС з шырокім мандатам і вялікім бюджэтам. Сёння актывісты і журналісты па ўсім свеце абвінавачваюць яе ў парушэнні нормаў міжнароднага права.

**Пётр ДУНЬКО.**

### ТЫМ ЧАСАМ

## Узмацнілі ахову граніцы

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы беларускія пагранічнікі ўзмацняюць ахову Дзяржаўнай граніцы. Пра гэта БелТА паведаміў афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон Бычкоўскі.

«У першую чаргу ажыццёўлена дадатковае ўзмацненне зялёнай мяжы. Павялічана колькасць нарадаў, ажыццёўлены манеўр сіл і сродкаў з другарадных напрамкаў на найбольш значныя», — распавёў Антон Бычкоўскі. Паводле яго слоў, з улікам наяўнага становішча органамі пагранічнай службы ўдакладнена ўзаемадзеянне з падраздзяленнямі Міністэрства абароны і ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў для фарміравання рэзерваў з падраздзяленняў.

# ЗМЯНЕННІ Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ АБ ГРАМАДЗЯНСТВЕ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 302, які ўносіць змяненні ў іншыя ўказы кіраўніка дзяржавы. Дакумент прыняты ў развіццё апошніх паправак у закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь». Пра гэта паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Указам, у прыватнасці, урэгуляваны працэдурныя пытанні, звязаныя з увядзеннем такога новага інстытута, як аднаўленне ў грамадзянстве, а таксама з пашырэннем катэгорый іншаземцаў і дзяцей, якія атрымалі правы на набыццё грамадзянства ў спрошчаным парадку.

Дадаткова замацоўваюцца парадак унясення Прэзідэнту матэрыялаў аб страце беларускага грамадзянства натуралізаванымі асобамі за ўдзел у экстрэмісцкай дзейнасці або прычыненне цяжкай шкоды інтарэсам Беларусі і працэдура спынення разгляду заяў аб набыцці грамадзянства ў выпадках, прадугледжаных названым законам.

Акрамя таго, з улікам маючага адбыцца ўвядзення біяметрычных дакументаў актуалізаваны ўсе пералікі дакументаў, якія падлягаюць прадстаўленню заяўнікамі ў мэтах набыцця або спынення грамадзянства.

Актуальна

**Наталля КАЧАНАВА**:

## «Мы рашуча асуджаем умяшанне ва ўнутраныя справы Кубы»

**На адрас старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай паступіла пасланне старшыні Нацыянальнай асамблеі народнай улады Рэспублікі Куба Эстэбана Лас Эрнандэса з інфармацыяй аб сітуацыі, якая склалася ў Рэспубліцы Куба.**

Наталля Качанава накіравала пасланне ў адказ са словамі падтрымкі кубінскаму народу.

— Мы рашуча асуджаем умяшанне ва ўнутраныя справы вашай краіны і выказваем сваю салідарнасць з народам Кубы ў абароне незалежнасці і суверэнітэту, супрацьстаянні знешняму ціску.

«Сяброўскія і даверлівыя адносіны паміж нашымі дзяржавамі з'яўляюцца ўзорам у сістэме міжнародных адносін і характарызуюцца высокай ступенню супадзення пазіцый па ключавых праблемах сучаснасці», — гаворыцца ў пасланні.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што ва ўмовах складанага міжнароднага становішча мы павінны актыўна аб'ядноўваць свае намаганні і каардынаваць знешнепалітычныя дзеянні на міжнароднай арэне, энергічна прасоўваць у жыццё праекты эканамічнага супрацоўніцтва на карысць беларускага і кубінскага народаў.

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 7 жніўня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

• кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

**Учора ў Клімавіцкім раёне пасля рэканструкцыі адкрыўся мемарыяльны комплекс партызанскай славы «Усакіна». Рашэнне аднавіць мемарыяльны комплекс было прынята ў мінулым годзе пасля просьбы жыхароў Клічава правесці рэканструкцыю.**



«Літаральна ў кожным населеным пункце Беларусі ёсць помнікі, абеліскі, брацкія магілы, якія нагадваюць нам аб вайне, увекавечваюць подзвігі нашых дзядоў і прадзедаў, — сказаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА** падчас адкрыцця комлекса. — Такія мемарыялы — святыя месцы для ўсіх беларусаў. Паколькі памяць аб мінулым — гэта сувязь з сучасным. Мы схіляем галовы перад героямі, якія аддалі жыццё за нашу незалежнасць і нашу перамогу, і дзякуючы ім упэўнена глядзім у будучыню. Гераічны прыклад загінулых дае нам сілы для жыцця».

**БелТА.**

Надвор'е

# ДА ГАРАЧЫНІ ПРЫВЫКАЕШ...

## А калі ўначы ўсяго плюс 10 градусаў, гэта ўжо холадна

**Першы тыдзень апошняга месяца лета ў нашай краіне характарызаваўся няўстойлівым і ўмерана цёплым надвор'ем. Сярэднясутачная тэмпература паветра знахо дзілася ў межах 17—22 цяпла, што блізка да нормы, а па ўсходзе краіны было на 1-2 градусы вышэй за яе. Перыядычна адзначаліся дажджы рознай інтэнсіўнасці, якія суправаджаліся навальніцамі і (месцамі) моцнымі ліўнямі. А ў выхадныя цёплае надвор'е будзе суправаджацца дажджамі рознай інтэнсіўнасці, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу цэнтр цыклона, які сёння прынёс пахмурнае і дажджлівае надвор'е, перамесціцца з нашай тэрыторыі на краіны Балтыі, і Беларусь будзе знаходзіцца ў яго тылавой зоне. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагназуюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 11—18 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да 18—25 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у нядзелю пад уплывам зоны павышанага атмасфернага ціску чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі на захадзе ёсць верагоднасць кароткачасовых дажджоў, магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах краіны прагназуецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ўсяго плюс 8—15 градусаў. Удзень будзе ад плюс 22 да 29 цяпла.

А вось у пачатку наступнага тыдня ўмовы надвор'я будуць знаходзіцца пад уплывам няўстойлівых паветраных мас і малаактыўных атмасферных франтоў, якія наступаюць з Заходняй Еўропы. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы і будзе ўмерана цёпла. У панядзелак тэмпература паветра ўначы складзе плюс 11—18 градусаў. Удзень будзе плюс 21—28 градусаў, а па паўднёвым усходзе краіны — 29—31 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# УСЕ КОЛЕРЫ ГУЛЬНЯЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

З баявым настроем, зададзеным Ірынай Курачкінай, беларускія спартсмены працягваюць выступленне ў алімпійскім Токіа.

**БАРАЦЬБА.** Дзяніс Храмянкоў (125 кг) завяршыў сваё выступленне на Алімпіядзе. Алі Шабанаў страціў шанцы стаць бронзавым прызёрам Гульняў. У суцяшальным паядынку ён уступіў МайлсуНазему Аміну. А Магамедхабіб Кадзімагамедаў (74 кг) у паўфінале перамог італьянца Франка Чаміса і замацаваў за сабой як мінімум сярэбраны медаль. Ванеса Каладзінская ўступіла ў схватцы з кітаянкай Цяньюй Пан і не выйшла ў фінал спаборніцтваў. У пятніцу свой першы алімпійскі паядынак правядзе Аляксандр Гуштын.

**ВЕСЛАВАННЕ НА БАЙДАРКАХ І КАНОЭ.** Алена Наздрова ў заездах на 200 метраў заняла трэцяе месца ў фінале Б. Але медалі ў гэтай дысцыпліне разыгрываюцца ў фінале А. Марына Літвінчук і Вольга Худэнка завяршылі свае суцяшальныя заезды ў фіналах на 500 метраў. Мікіта Борыкаў і Алег Юрэня занялі сёмае месца ў гонках байдарак-двоек на 1000 метраў.

Беларусы працягваюць выступаць у іншых дысцыплінах. Так, 6 жніўня на старт заездаў каноэ-двоек на 500 метраў выйдуць Надзея Макарчанка і Дарына Пікулева. Надзея Макарчанка адразу паказала, на што яна здольная. У 2017 годзе, у 18 гадоў, яна стала лаўрэатам прэстыжнай прэміі World Paddle Awards (WPA) у катэгорыі Sports Junior, якая штогод прысуджаецца найлепшым весллярам планеты. У пятніцу пачнуцца спаборніцтвы байдарак-чацвёрак на 500 метраў. На вяслярных каналах Токіа будуць выступаць бронзавыя прызёры Рыа Марына Літвінчук, Маргарыта Махнева, Вольга Худэнка, Надзея Папок. У 2016 годзе яны заваявалі «бронзу» ў спаборніцтвах байдарак-чацвёрак на 500 метраў. У мужчынскай частцы спаборніцтваў свае сілы праверыць Мікіта Борыкаў, Уладзіслаў Літвінаў, Аляксей Місючэнка і Дзмітрый Натынчык.

**ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА.** Карына Дзямідзік у скачках у вышыню паказала вынік 1 м 90 см і не выйшла ў фінальную стадыю турніру, куды адабраліся 14 спартсменак з вынікам 1 м 95 см. Ірына Жук заняла восьмае месца ў фінале скачкоў з шастом. У сваёй найлепшай спробе яна ўзяла вышыню ў 4 м 50 см. Затым яна тройчы спрабавала скокнуць на 4 м 70 см, але ёй гэта не ўдалося. Эстафетная каманда 4х400 з вынікам 3 хвіліны 33,00 секунды не змагла выйсці ў алімпійскі фінал. Аляксандр Ляховіч у спартыўнай хадзьбе на 20 км заняў 44-е месца з вынікам 1 гадзіна 31 хвіліна і 47 секундаў.

А спаборніцтвы па спартыўнай хадзьбе працягнуцца і далей. Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 2018 года Дзмітрый Дзюбін у Токіа пройдзе дыстанцыю ў 50 кіламетраў. Дарэчы, медаль кантынентальнага першынства ён заваяваў менавіта на гэтай дыстанцыі. Вікторыя Рашчупкіна, Настасся Рароўская пройдуць дыстанцыю ў 20 кіламетраў. Ганна Цярлюкевіч алімпійскі нарматыў у Токіа (1.29,59) выканала ў першы год пасля вяртання з дэкрэтнага водпуску.

**МАСТАЦКАЯ ГІМНАСТЫКА.** У пятніцу на сваіх першых Алімпійскіх гульнях выступяць адзіночніцы Настасся Салас і Аліна Гарнасько. Мастацтва ў жыцці Аліны Гарнасько ёсць не толькі ў гімнастыцы. Дзяўчына стварае карціны, размалёўвае адзенне. Аліна — вучаніца адзінай алімпійскай чэмпіёнкі ў гісторыі Беларусі Марыны Лобач. Настасся Салас лёгкая на гімнастычным дыване, але моцная ў жыцці. Дзяўчына пераехала ў Беларусь з Расіі, а сям'я засталася ў Барнауле. Дзеля спартыўнай кар'еры дзяўчына адважылася на разлуку з сям'ёй і самастойнае жыццё ў іншай краіне. Усё гэта аказалася не дарма. Настасся Салас — уладальніца салітнай калекцыі медалёў розных турніраў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Агульная колькасць захварэлых на ковід перавысіла 200 мільёнаў чалавек



Па падліках амерыканскага ўніверсітэта Джонса Хопкінса, колькасць пацверджаных выпадкаў каранавіруса ў свеце перавысіла 200 мільёнаў. Пры гэтым з-за штама «дэльта» тэмпы распаўсюджвання COVID-19 апошнім часам паскорыліся. Эксперты кажуць, што масавая імунізацыя запавольвае пандэмію і дапамагае прадухіліць гібель людзей, але вакцын на ўсіх не хапае.

Як адзначае агенцтва «Рэйтэр», каранавірусам заразілася сама меней 2,6 працэнта насельніцтва Зямлі (кожны сакраваы). Калі б усе, хто захварэў, склалі краіну, яна стала б восьмая па колькасці насельніцтва ў свеце. Універсітэт Джонса Хопкінса, які ў сваіх падліках выкарыстоўвае афіцыйную статыстыку, паведамляе, што ад каранавіруса памерла больш за 4,2 млн чалавек па ўсім свеце. Аднак навукоўцы з Універсітэта Вашынгтона заявілі, што звесткі аб смяротнасці ад COVID-19 у свеце заніжаныя ўдвая. Калі адзнаку ў 100 млн дыягназаў COVID-19 перадолеў на працягу года, то яшчэ сто мільёнаў чалавек захварэлі ўжо на працягу наступных шасці месяцаў. Цяпер найвышэйшая штотыднёвая колькасць хворых рэгіструецца ў ЗША, Бразіліі, Інданезіі, Індыі і Іране.

## Дзейнасць Зяленскага не ўхваляюць амаль 60 працэнтаў украінцаў

Пра гэта сведчаць вынікі апытання Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі (КМІС), апублікаванага на яго афіцыйным сайце. «З 34,1 % у чэрвені да 29 % зменшылася доля тых, хто ўхваляе дзейнасць прэзідэнта Уладзіміра Зяленскага. У той жа час, з 52,7 % да 56,1 % павялічылася доля тых, хто не ўхваляе яго дзейнасць», — адзначылі ў інстытуце. Паводле вынікаў даследавання, 43,2 % апытаных падтрымліваюць правядзенне датэрміновых прэзідэнцкіх выбараў і 48,7 % ухваляюць правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў. Украінцы адзначылі пагаршэнне ўзроўню жыцця ў краіне за апошні год. «Па суб'ектыўных адчуваннях, 47,6 % рэспандэнтаў лічаць, што ў параўнанні з летам 2020 года іх сем'і цяпер жывуць горш», — падкрэслілі ў КМІС.

# Першая цаглінка

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Яна вельмі рада, што заступіла на пасаду інжынера ў архітэктурна-праектнай майстэрні камбіната. Згаданае структурнае падраздзяленне — калектыў архітэктараў, канструктараў і інжынераў, здольных у кароткія тэрміны выдаць і абараніць якасны праект. У творчым багажы майстэрні — дзясяткі распрацаваных і пабудаваных дамоў у Беларусі і Расіі.

— На чацвёртым курсе менавіта тут пашчасціла праходзіць пераддыпломную практыку, — расказвае дзяўчына. — Вучылася складаць каштарысы, разбірацца ў нарматыўных дакументах, чытаць чарцяжы. Работа падчас вытворчай практыкі дапамагла напісаць дыплом — распрацавала ўласны праект будаб'екта, прапанаванага для выканання на камбінаце.

Анастасія прыступіла да службовых абавязкаў адна з першых сярод студэнтаў свайго выпуску. Лічыць: тое, што атрымала сваё першае рабочае месца на адным з вядучых будаўнічых прадпрыемстваў не толькі ў рэгіёне, але і ў краіне, — матывуе да работы. Падтрымліваюць Настассю і ў сям'і. Яе тата — прафесійны будаўнік. Ён прайшоў шлях ад рабочага, майстра ўчастка, прараба да кіраўніка будаўнічага прадпрыемства. Сама дзяўчына марыць «вырасці» ў дасведчанага інжынера-будаўніка, праектаваць жылыя дамы і прамысловыя будынкі.

Сёлета сярод маладых спецыялістаў з дыпломамі ВНУ, якія атрымалі размеркаванне на Гомельскі домабудаўнічы камбінат, — выпускнікі БелДУТа і Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога.

— Шэсць выпускнікоў БелДУТа размеркаваныя на пасады майстроў на будаўнічым комплексе прадпрыемства, двое — на пасады геадэзістаў, двое — накіраваныя на работу ў архітэктурна-праектную майстэрню, адзін выпускнік прыступіць да работы майстрам аддзела тэхнічнага кантролю на заводзе буйнапанэльнага домабудавання, — пералічыла **намеснік генеральнага дырэктара па кадрах, ідэалагічнай і сацыяльнай рабоце ААТ «Гомельскі домабудаўнічы камбінат» Анджаліна СЫРАМЯТНІКАВА.** — Маладыя спецыялісты — выпускнікі ГДТУ імя Сухога — размеркаваныя на пасады інжынераў-электронікаў.



Анастасія РУБАНАВА — малады спецыяліст — інжынер групы каштарысаў і эканамічных абгрунтаванняў архітэктурна-праектнай майстэрні ААТ «Гомельскі домабудаўнічы камбінат»

Таксама прыйшлі на прадпрыемства выпускнікі Гомельскага дзяржаўнага прафесійнага тэхналагічнага ліцэя, Гомельскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа, Чачэрскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя, Гомельскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя рачнога флоту. Яны працаўладкаваныя на пасады слесара па рамонце аўтамабіляў, муляра, электраманцёра, спецыяліста-сантэхніка.

— Варта адзначыць, што ўсе маладыя спецыялісты вельмі матываваныя на работу, — звяртае ўвагу Анджаліна Сырамятнікава. — Яшчэ падчас вучобы, да размеркавання яны звярталіся на прадпрыемства, заяўлялі пра сябе, мы з імі гутарылі, хтосьці праходзіў на камбінаце вытворчую практыку. На папярэднім размеркаванні студэнты ВНУ атрымалі ад камбіната гарантыйныя лісты, што будуць прынятыя на работу.

Прыняцце новага чалавека ў каманду — заўсёды адказная справа. На Гомельскім домабудаўнічым камбінаце імкнуцца захоўваць самую высокую культуру вытворчасці, і работа кожнага спецыяліста, вядома, уплывае на агульны імідж.

— Маладыя спецыялісты, якія прыйшлі на сваю першую работу на прадпрыемства, павінны разумець, што атрымаюць абарону сваіх прафесійных, працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў, — звяртае ўвагу **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў Дзмітрый МУРАШКА.** — Яны заўсёды могуць разлічваць на сацыяльную справядлівасць у пытаннях арганізацыі і аплаты працы, захаванне грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства. Галоўнае, каб самі належна выконвалі службовыя абавязкі, імкнуліся расці і развівацца. Мы ў сваёй рабоце імкнёмся развіваць сацыяльнае партнёрства паміж прафсаюзамі і наймальнікамі, дзяржаўнымі і гаспадарчымі органамі кіравання.

Прафсаюзы адзначаюць: прэферэнцыі для работнікаў ад наймальніка таксама значна стымулююць. Для супрацоўнікаў камбіната, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, напрыклад, дзейнічае першачарговае права выбару жылля ў жылых аб'ектах, што ўзводзяцца прадпрыемствам. На першы ўзнос даецца растэрміноўка на паўгода. Вельмі папулярнае сярод работнікаў забеспячэнне медыцынскай страхоўкай на пяць тысяч рублёў у год.

Стымулюе імкненне годна працаваць і падтрымліваць гонар свайго калектыву таксама разуменне значнасці аб'ектаў, якія ўзводзіць прадпрыемства, упэўнены кіраўнік прафсаюза будаўнікоў Гомельшчыны.

— Народны праект — мемарыяльны комплекс «Ала» ў Светлагорскім раёне — рэалізаваны Гомельскім домабудаўнічым камбінатам, — нагадвае Дзмітрый Мурашка. — Цяпер спецыялісты гэтага прадпрыемства выконваюць усе асноўныя будаўнічыя работы чарговага народнага праекта памяці на Гомельшчыне. Размова пра рэканструкцыю комплексу «Партызанская крынічка» ў Гомельскім раёне. У Петрыкаўскім пабудаваны жылыя дамы для работнікаў горна-абагачальнага камбіната. У Буда-Кашалёўскім рыхтуецца да адкрыцця новы свінагадоўчы комплекс з замкнёным цыклам вытворчасці на 24 тысячы галоў у СУП «Андрэеўка».

Забяспечваюць гомельскія спецыялісты і экспарт будаўнічых паслуг. Яны запатрабаваныя на будоўлях Расійскай Федэрацыі. Цяпер, напрыклад, менавіта гамяльчане выконваюць кантракт на ўзвядзенне буйнога жылога мікрараёна ў Калузе, прапрацоўваюцца кантракты на экспарт будаўнічай вытворчасці на тэрыторыі Бранскай вобласці, адзначае **генеральны дырэктар ААТ «Гомельскі домабудаўнічы камбінат» Аляксандр ГАНЧАРОЎ.**

— Дзень будаўніка адзначаць і ў кабіне вежавага крана, і ў глыбокім падзямеллі новых ветак метро, і ва ўтульных кабінетах праектных бюро, — кажа ён. — Вядома, ад работы будаўніка залежыць якасць жыцця мільёнаў людзей. Веру, што апантанасць спецыялістаў абранай справай дапаможа расквітнець нашай краіне.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**



Сацыялогія

# «ГЭТА ТОЕ, ШТО ЛЮДЗІ БАЧАЦЬ»

**Працягваем знаёміць чытачоў з вынікамі апытання грамадскай думкі, якое з 5 па 21 ліпеня праводзіў Аналітычны цэнтр EcooM з прыцягненнем фонду «Украінская палітыка» па заказе ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» — АНТ. Апрацаваныя даныя карэспандэнту БелТА пракаменціраваў дырэктар аналітычнага цэнтра EcooM Сяргей МУСІЕНКА. У прыватнасці, рэспандэнтам прапаноўвалася даць ацэнку дзеянням урада, апазіцыі (старой і новай) за мінулы год па шкале ад 1 да 10. У выніку дзеянні ўрада атрымалі ацэнку 6,69 бала, старой апазіцыі — 1,78, новай — 1,47.**

«Гэта пытанне вельмі паказальнае. Людзі помняць, што нейкая праграма, нейкія лідары былі ў старой апазіцыі. А ў новай — яны нічога гэтага не заўважылі. Прычым вельмі часта такія ацэнкі давалі нават людзі апазіцыйна настроеныя — гэта было відаць па анкеце. Проста ва ўсе часы і ў любой краіне ёсць такая катэгорыя людзей, якія з самага пачатку супраць урада, заўсёды. Але за што ставіць беларускай апазіцыі больш высокую ацэнку, чым нуль (хоць шкала ад адзінкі)? За веданне беларускай мовы? За прапаноўванне нейкіх навацый для краіны і людзей? Мы іх не чулі. А старая апазіцыя гэта як памяць, што былі нейкія людзі, якія хацелі нешта зрабіць лепш. Міфалогія памяці. Хацелі, але не зрабілі, народ не той напэўна? А ўрад канкрэтна робіць — магазіны працуюць, у бальніцах лечаць, лакдаўнаў і каменданцкай гадзіны няма, — сказаў Сяргей Мусіенка. — На мой погляд, ацэнка ўрада магла бы быць і вышэйшай, таму што ён працуе як мае быць, зладжана, спакойна — так, што цалкам можна самапіярам займацца.

Сяргей Мусіенка падкрэсліў, што пасля апошніх падзей ацэнкі апазіцыі могуць стаць яшчэ ніжэйшымі. «Гэта пытанне задавалася да гучнай паездкі адной грамадзянкі ў ЗША. Было б цікава паглядзець, як змяніліся лічбы пасля гэтага. Хоць лічба і так нізкая. Але вы ведаеце, адчуванне ж іншае — як крошкі з панскага стала падхапіла, — адзначыў дырэктар EcooM. — Тут ёсць іншы момант. Калі вас у госці запрасілі, гарбаты не налілі, кавай не пачаставалі і есці не прапанавалі, няеж будзеце па-іншаму глядзець на гэта запрашэнне? Або вас не запрашалі? Што за гэтым стаіць? Я, напрыклад, пагаварыў з дыпламатамі, людзьмі, якія разумеюць у пратаколе. І такая нечаканая ацэнка дыпламатаў. Каб ніхто не абвінаваціў, што гэта сустрэча мела нейкі афіцыйны характар, каб не сказалі, што прэзідэнт краіны з кімсьці там непрызнаным сустракаўся, яму параілі падачку са стала вынесці. Канстатавалі для іншых наглядальнікаў, што гэта дзеянне — не афіцыйная сустрэча. На афіцыйнай сустрэчы ўявіць дыпламатаў, кіраўнікоў краіны, якім штосьці са стала далі — гэта знявага для краіны і гэтай дэлегацыі. Гэта так расцэньваецца ў этыкеце.. Такі сігнал праз пратакол. А палітыка ўжо сотні гадоў менавіта на такіх тонкіх рэчах і пабудавана. Тым больш набліжаецца змена куратара нашага напрамку ў самім дзяржэдпе, планеуцца прыход кампетэнтнага і жорсткага чалавека, які спытае, што зрабілі, рэвізію правядзе, дасць ацэнку».

Што датычыцца даверу да беларускай апазіцыі, то ў ліпеньскім апытанні праведзены параўнальны аналіз даных, атрыманых у час лютаўскага апытання, праведзенага па заказе БелТА. У выніку давер беларускай апазіцыі ў лютым выказвалі — 3,8 працэнта, у ліпені — толькі 2,8 працэнта. «Хутчэй давяраю»: люты — 13,4 працэнта, ліпень — 7,6 працэнта. «Хутчэй не давяраю»: люты — 25,2 працэнта, ліпень — 24,3 працэнта. Пры гэтым не давярае беларускай апазіцыі 41,6 працэнта апытаных. У лютым гэта лічба была 38,2 працэнта. Не змаглі адказаць 23,7 працэнта цяпер і 19,4 працэнта ў лютым.

«Спад адказаў "давяраю" і «хутчэй давяраю» практычна двухкратны. Да такога выніку прывялі дзеянні апазіцыі за мінулыя паўгода. Заўважце, працэнт «хутчэй не давяраю» практычна захаваўся. Больш жорсткі «не давяраю» крыху падняўся. Але ў цэлым «не давяраюць» і «хутчэй не давяраюць» 66 працэнтаў апытаных. Відавочны вынік іх дзейнасці за паўгода ў наяўнасці. Працэнт тых, хто не змог адказаць, у прынцыпе таксама захаваўся. Гэта значыць, за паўгода давер да апазіцыі ўпаў у два разы. Іх заклікі і дзеянні прывялі людзей да непрымання», — падкрэсліў Сяргей Мусіенка.

На пытанне: ці маюць старая і новая апазіцыя вялікую перспектыву і зразумелую праграму, «так» у старой беларускай апазіцыі адзначылі 0,4 працэнта апытаных, у новай — 0,8 працэнта. «Хутчэй так» — 5 працэнтаў і 1,4 працэнта адпаведна. «Хутчэй не» — 21,7 працэнта і 17,6 працэнта. «Не» — 31 працэнт і 37,9 працэнта апытаных.

«За 25 гадоў існавання з сацыялагічнага пункту гледжання наогул цяжка зразумець, што такое старая апазіцыя, а што новая. Проста год таму нейкія новыя людзі прыйшлі і захацелі «пакіраваць» замест старых. Гэта тое, што людзі бачаць. Гэта не экспертнае меркаванне. Гэта меркаванне насельніцтва. І дакладнае разуменне ў людзей, што няма перспектывы і выразнай праграмы ні ў старой, ні ў новай апазіцыі. «Не магу адказаць» — 41,9 працэнта. Практычна такая ж лічба ў новай апазіцыі — 42,3 працэнта. Людзі, нават маючыя сімпатыю да апазіцыі, думаюць: можа, я не бачыў гэтую праграму? Можа, яна недзе ёсць? Прычым заўважце, 40 працэнтаў людзей, якія без цяжкасцяў адказваюць на нейкія зразумелыя пытанні, аб праграме і перспектыве апазіцыі не ведаюць, што сказаць. Цікава. Гэта таму, што праграмы не толькі не бачылі, але і перспектыў не бачаць. Гэта шмат аб чым сведчыць. Інакш кажучы, узнікае часам адчуванне, што чым больш мы будзем паказваць выказванняў на тэлебачанні прадстаўнікоў так званай новай апазіцыі, тым больш у яе рэйтынг будзе падаць. Ды ўжо і так практычна два працэнты засталося, якія штосьці аб перспектыве і выразнай праграме ведаюць. Тут людзі проста не разумеюць, пра што размова. Праграмы няма — выразнай перспектывы няма. Наогул нічога выразнага. Такая рэчаіснасць», — сказаў на заканчэнне Сяргей Мусіенка.

Дарога да храма

# ПОШУК ВЕЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**Шмат разоў, збочыўшы з брэсцкай трасы, праязджаючы ад Міра да Карэліч, і добра ведаючы гэты адрас, царкву на могілках каля вёскі Загор'е выхопліваеш літаральна за лічаныя секунды. Такое самае ўражанне, такая ж сустрэча вокамгненнага характару складваецца і на зваротнай дарозе — калі вяртаешся з Карэліч... Тут трэба спыняцца на якую гадзіну-другую, каб як след агледзець гэтую мясціну і паспрабаваць пачуць подых часін, дакрануцца да розных стагоддзяў, задумацца пра чалавека ў прасторы вечнасці, паразважаць пра трывогі і сумненні хуткаплыннага жыцця, якое для кожнага з нас было і застанецца ў выпрабаваннях і веры...**



Мяне прывёў сюды мясцовы карэліцкі будаўнік Сяргей Дунец. Яму і яго памагатым-паплечнікам давялося займацца рэканструкцыяй, лічы — будаўніцтвам новага памяшкання праваслаўнага храма...



Яшчэ ў 1861 годзе на ахвяраванні мясцовых жыхароў тут, на могілках, каля Загор'я, была ўпершыню пабудаваная драўляная царква... Зруб пад двухсхільным дахам, у цэнтры — макаўка. Фасад быў вырашаны чатырохступеньчатай тэрасай пад трохвугольным франтонам. Вертыкальна абшаляваныя фасады рассечаныя прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Так апісалі навукоўцы храм праведнай Ганны... Колькі падзей з ім звязана — і нараджэнні, і смерці, радасць і гора, колькі людзей, пранікліва ўглядаючыся ў глыбіні абразоў, адкрывалі ў сценах царквы нешта сутнаснае, вартае таго, каб прайсці з ім па жыцці ці паглыбіцца ў нечым галоўным, сапраўдным, шукаючы сваё ўласнае месца ў вечнасці... За многія дзесяцігоддзі прайшла і драўляная царква свой шматпакутны лёс. Мяняліся ўлады. Розныя ідэалогіі накладвалі сваю пячатку на канкрэтныя храмы, забараняючы вернікам падтрымліваць іх годны выгляд. Ды і час рабіў сваю справу. Вось і наспела патрэба абнаўлення старога будынка.

— Так склалася, што да нашых мясцін прычыніўся прадпрымальнік Генадзь Сабалеўскі, — расказвае Сяргей Дунец. — А ўжо менавіта ён як фундатар, клапатлівы арганізатар усіх матэрыяльных выдаткаў, і выбраў нас на ролю будаўнікоў. Вось некаторы час таму і вырасла новая царква, ужо «апранутая» ў чырвоную цэглу... Уражваюць мазаіка, скульптура, вітражы. На даху царквы ўстаноўлены сонечныя батарэі, якія асвятляюць храм і блізкую тэрыторыю, прыцягваюць сюды вандроўнікаў і ў вячэрні час. Прыемна, што адналенне, новае нараджэнне адбылося ў пярэдадзень 160-годдзя першага нараджэння храма... Людзі (а жыццё паказвае, што гэта — і моладзь, новыя пакаленні) прыходзяць на вядомае іх прадзедам, дзядам, прашчурам месца і, як мне падаецца, адчуваюць святло, судакранаюцца з мінулым і перадаюць свой настрой зусім юным, для каго, спадзяюся, царква ў Загор'і стане роднай і блізкай... Складаючы сцены царквы, мы стараліся, каб кожнаму з наведвальнікаў храма было прыемна судакрануцца з прыгажосцю, светласцю гэтай пабудовы...

З абнаўленнем храма, здаецца, змянілася і сама атмасфера мясціны. Пра тое, што царква праведнай Ганны прыцягвае людзей, становіцца своеасаблівым выхаваўчым асяроддзем, мы размаўлялі на могілках у Загор'і са старастай прыхода Вольгай Віктараўнай Ходар. Яна звярнула нашу ўвагу на пліту ў храме з прозвішчамі землякоў, якія не прыйшлі з мінулай вайны... Вялікая Айчынная ў гэтых мясцінах звязаная з многімі драматычнымі падзеямі. Варта зазірнуць у мастацкія і дакументальныя творы народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля, чый талент якраз тут, у Загор'і і яго ваколіцах, і выпеставаны, у творы легендарнага партызана-літаратуразнаўца Уладзіміра Калесніка, — і перад вачыма адкрыецца шырокая карціна партызанскай памяці. А яшчэ кожны з мясцовых жыхароў ведае сваю ўласную сямейную гісторыю. Сабраўшы на пліце прозвішчы ўсіх землякоў, якія не вярнуліся з вайны, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар біялагічных навук Мікалай Ламан зрабіў высакародную справу захавання гістарычнай памяці. Вялікія падзеі заўжды ўспрымаюцца намі, калі адкрываецца нешта асабістае...

— А яшчэ Мікалай Афанасьевіч, — расказвае староста Вольга Віктараўна, — высадзіў па перыметры могілак хвоі, якія сам купіў у гадавальніку. Цяпер вунь як вымахалі! І ўглядаючыся ў іх раўнюткі радочак, нельга не пакланіцца добрай справе... Нашы вёскі Загор'е, Турэц, якія зусім побач (у Турцы, дарэчы, ёсць вялікі, таксама з дзевятнаццатага стагоддзя, праваслаўны храм) — з багатай гісторыяй. І мне здаецца, што ў летапіс нашых мясцін увойдзе і сённяшняе аднаўленне царквы праведнай Ганны. А вернікі з Загор'я, госці, якія да нас прыязджаюць, будуць і надалей памятаць, што ўсіх збірае свята 7 жніўня...



З храмам не дазваляе хутка развітацца і адмысловае яго мастацкае афармленне. Над вітражамі, мазаікамі для царквы працаваў вядомы беларускі мастак Віктар Барабанцаў. Яго творчыя здабыткі высока ацэненыя ў нашай дзяржаве. Мастак узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, з'яўляецца лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне».

— І хоць нарадзіўся я на Гомельшчыне, — расказвае Віктар Барабанцаў, — усё ж прыкіпеў менавіта да гэтых навагрудскіх, карэліцкіх узгоркаў... Часта ездзіў сюды на пленэры. Мяне і храмы ў гэтай прасторы прыцягваюць, і пэўны ўзвышаны творчы настрой надае сама гістарычнасць, унікальнасць гэтых мясцін...

«Вясна ў Міры», «Мір. Красавіцкая раніца», «Сустрэча ў Навагрудку», «Свята ў Міры. Партрэт пісьменніцы Вольгі Іпатавай», «Подых вякоў. Зямля Навагрудская. Трыпціх» — гэтыя і іншыя карціны, партрэты Віктара Барабанцава напоўненыя радасцю, светлымі фарбамі. Насустрач позірку гледача выпраменьваюцца снег, ясныя прасторы, чыстае неба... Так і ў мазаіках, якія аберагаюць сваімі зіхоткімі праменьчыкамі царкву праведнай Ганны на могілках у Загор'і, — сонца, светласць навокал, здаецца, пры любым надвор'і. Сюжэты, вобразы, якія прыўнёс мастак у аздабленне храма, — гэта і вынік багатага папярэдняга вопыту такой работы Віктара Барабанцава. За плячыма ў творцы — і шматколерныя фрэскі на сюжэты Свяшчэннага Пісання, якія аздабляюць сцены ў царкве ў вёсцы Лебедзева Маладзечанскага раёна, мазаічнае пано «Прападобная Ефрасіння, ігумення Полацкая», якое размешчана над уваходам у храм «Усіх тужлівых Радасць», мазаікі, якія ўпрыгожваюць царкву Марыі Магдаліны ў Мінску. Высокі талент жывапісца, мастака-рэаліста дапамог Віктару Барабанцаву сягнуць і ў калісьці новыя для яго таямніцы царкоўнага мастацтва. Майстар і ў творах, якія аздабляюць святыню ў Загор'і, здолеў знайсці тую інтанацыю, якая злучае ў адно цэлае і вечнасць, і тутэйшую, уласцівую гэтай старонцы прыземленасць. Можа, таму і такой прыцягальнай, роднай, надзіва блізкай і па-свойму зразумелай падаецца праваслаўная царква праведнай Ганны на могілках каля вёскі Загор'е?.. Будзеце ехаць у Карэлічы пры любой нагодзе — не абмінайце яе. Спыніцеся. Угледзьцеся ў зробленае сучаснікамі нашымі, угледзьцеся ўважліва — і вы, упэўнены, адчуеце вечнасці запавет, адчуеце дух нашых прашчураў. А жыццё, пагадзіцеся, нечага вартае, калі сыходзяцца розныя стагоддзі, калі, дбаючы пра «сёння» і «заўтра», мы шануем мінуўшчыну і традыцыі.



**Мікола МІРШЧЫНА.**
**Фота Кастуся ДРОБАВА.**

---

Будзь у курсе!

# «ГІСТАРЫЧНЫ БАГАЖ» НА ВАКЗАЛЕ

**Інтэрактыўная выстаўка пад такой назвай размясцілася ў зале чакання на трэцім паверсе вакзала станцыі «Мінск-Пасажырскі».**

Экспазіцыя прысвечана гісторыі горада-героя Мінска, у тым ліку подзвігу жыхароў сталіцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выдатным асобам, помнікам архітэктуры, мемарыяльным комплексам, музеям і г. д. Праект рэалізоўваецца ў рамках Года народнага адзінства.

Стэнды ўладкаваныя ў выглядзе прыадчыненага чамадана, усярэдзіне якога размешчана гістарычная інфармацыя. Цэнтральнае месца экспазіцыі займае інтэрактыўны



дысплэй з картай мясцовасці. Тут жа можна пачуць відэааповед і ўбачыць слайд-шоу з элементамі інфаграфікі, якое складаецца з фатаграфій, у тым ліку архіўных. Можна выбраць па жаданні раздзелы і аб'екты, якія зацікавілі, і атрымаць па іх гістарычную даведку.

Месца размяшчэння экспазіцыі невыпадковае, падкрэслілі ў прэс-цэнтры магістралі. Чыгуначныя дарогі, будаўніцтва якіх пачалося ў XIX стагоддзі, звязваюць рэгіёны і краіны, даюць імпульс іх эканамічнаму і культурнаму развіццю.

«Гістарычны багаж» — гісторыка-асветніцкі праект, мэта якога даступна і цікава расказаць падарожнікам пра гісторыю гарадоў і рэгіёнаў, якія яны наведваюць, акцэнтуючы ўвагу на асобных фактах і сюжэтах.

Праект рэалізоўваецца Расійскім гістарычным таварыствам сумесна з ААТ «Расійскія чыгункі», Інстытутам гісторыі Расійскай акадэміі навук і Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пры падтрымцы Беларускай чыгункі.

Нагадаем, што з ліпеня выстаўка «Гістарычны багаж» дэманструецца на вакзале станцыі «Брэст-Цэнтральны». Яна прысвечана гісторыі гэтага абласнога цэнтра і Брэсцкай крэпасці.

Плануецца, што жыхары і госці Брэста і Мінска змогуць папоўніць свой гістарычны багаж да канца года.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта БЧ.**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «РСП-12» (УНП 500011281), объявляет о проведении **17.08.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:**
https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/08/spisok-imushhestva-rsp-12-na-torgi-17.08.21.pdf

Местонахождение имущества: Гродненская область, Кореличский район, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, д. 54.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «РСП-12», тел. +375293667568.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, ком. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **16.08.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 06.08.2021** по **17.00 16.08.2021** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися, предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор: по лотам №№ 1, 5, 39, 99 – 3 % от цены реализации предмета торгов; по лотам №№ 41, 42, 44, 45 – 5 % от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам – 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-24117 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный цех), общей площадью 1002,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425450100001009305 (целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания квасильно-засолочного цеха), площадью 0,3377 га по адресу: г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж.
Начальная цена продажи лота – 71 400 руб. (семьдесят одна тысяча четыреста рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 7 140 руб. (семь тысяч сто сорок рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Слонимский филиал Гроднооблпотребобщества, 231800, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-663-38

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 августа 2021 г. в 14.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 09.02.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 17 августа 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

Лот 1: капитальное строение, инвентарный номер № 420/С-4284 (назначение – здание специализированного назначения, наименование – здание сепараторного отделения), расположенное по адресу: Лидский район, д. Белица. Составные части и принадлежности: ворота металлическая решетка на металлических столбах, инв. № 2063; ограждение из колючей проволоки, инв. № 2080; ограждение из металлической сетки, инв. № 2054.
Многолетние насаждения: береза, инв. № 9075; груша 2 шт., инв. № 9073, 9074; клен 2 шт., инв. № 90121; клен 32 шт., инв. № 90171; клен 4 шт., инв. № 9069; тополь, инв. № 9072; тополь 4 шт., инв. № 9071; ясень 6 шт., инв. № 9070.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423680400621000029 (назначение – для обслуживания Белицкого сепараторного пункта), площадью 0,9094, расположенном по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, д. Белица.
Начальная цена продажи – 2 511,48 руб. (две тысячи пятьсот одиннадцать рублей сорок восемь копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 251 руб. (двести пятьдесят один рубль)

Продавец – ОАО «Лидский молочно-консервный комбинат», г. Лида, ул. Энгельса, 116, тел. 8-0154-52-33-56

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 18 августа 2021 г. в 14.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 16 августа 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,**
**https://grino.by/aukcion/**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Технолит Полоцк», 211408, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101** |

**Оборудование и транспортные средства, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101**

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 568 | Автомат резьбонакатной /нест/ А9518А | 2 520,00 | 126,00 |
| 2 | 1574 | Вальцы 008Н047.00.000 | 2 982,00 | 149,10 |
| 3 | 3712 | Вальцы прокатки вн цилиндр 5РС-003 | 1 386,00 | 69,30 |
| 4 | 3711 | Вальцы прокатки вн цилиндр 5РС-003 | 1 386,00 | 69,30 |
| 5 | 200 | Горизонтально-фрезерный станок 6м 82А | 1 680,00 | 84,00 |
| 6 | 3275 | Машина листогибочная ИВ-1330 | 4 326,00 | 216,30 |
| 7 | 1543 | Ножницы гильотинные Н-475 | 2 268,00 | 113,40 |
| 8 | 47 | Ножницы гильотинные Н3118 | 1 764,00 | 88,20 |
| 9 | 4798 | Ножницы кривошипные листовые с наклонным ножом НП3121А | 18 816,00 | 940,80 |
| 10 | 4797 | Пресс листогибочный гидравлический с чпу ип143 | 63 840,00 | 3192,00 |
| 11 | 738 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 3 780,00 | 189,00 |
| 12 | 3527 | Станок вертикально-сверлильный МН-25-Н | 3 864,00 | 193,20 |
| 13 | 2494 | Станок вертикально-сверлильный 2н135 | 1 638,00 | 81,90 |
| 14 | 1988 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 1 638,00 | 81,90 |
| 15 | 2899 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 3 780,00 | 189,00 |
| 16 | 2008а | Станок вертикально-фрезерный 6М13гн-1 | 2 478,00 | 123,90 |
| 17 | 4760 | Станок для плазменной резки металла HY S | 26 838,00 | 1341,90 |
| 18 | 2279 | Станок координатно-расточной 2Д 450-Ф2 | 4 158,00 | 207,90 |
| 19 | 1015 | Станок координатно-расточной 2В440А | 2 856,00 | 142,80 |
| 20 | 3232 | Станок радиально-сверлильный 2532Л | 2 310,00 | 115,50 |
| 21 | 3443 | Станок радиально-сверлильный 2К522 | 2 856,00 | 142,80 |
| 22 | 523 | Станок токарно-винторезный SAMAT 400S/S.1.196 | 8 022,00 | 401,10 |
| 23 | 324 | Станок токарно-револьверный 1Е365БП | 3 444,00 | 172,20 |
| 24 | 409 | Токарно-винторезный станок 16к20 | 3 864,00 | 193,20 |
| 25 | 3789 | Станок токарно-винторезный 1в 62г | 1 890,00 | 94,50 |
| 26 | 2916 | Станок токарно-винторезный 1В62Г | 1 890,00 | 94,50 |
| 27 | 3143 | Станок токарно-винторезный 1В62Г | 2 268,00 | 113,40 |
| 28 | 858 | Станок токарно-винторезный 1К62 | 1 470,00 | 73,50 |
| 29 | 3508 | Станок токарно-винторезный АР-77 | 2 268,00 | 113,40 |
| 30 | 4712 | Станок токарно-винторезный ГС 526 | 14 616,00 | 730,80 |
| 31 | 1102 | Станок плоско-шлифовальный 3Д732 | 4 956,00 | 247,80 |
| 32 | 1589 | Вальцы 008.Н75.00.000 | 5 502,00 | 275,10 |
| 33 | 1323 | Станок фуговочный | 882,00 | 44,10 |
| 34 | 414 | Станок универсальный по дереву | 672,00 | 33,60 |
| 35 | 1987 | Бункер | 546,00 | 27,30 |
| 36 | 444 | Бункер суточного расхода | 420,00 | 21,00 |
| 37 | 1757 | Вентилятор ВЦ 4-75 | 126,00 | 6,30 |
| 38 | 201 | Вентилятор осевой | 168,00 | 8,40 |
| 39 | 511 | Вентилятор осевой В-06-300-8Б | 168,00 | 8,40 |
| 40 | 496 | Вентилятор осевой ВО-06-300-6.3с | 84,00 | 4,20 |
| 41 | 498 | Вентилятор осевой ВО-06-300-8Б | 168,00 | 8,40 |
| 42 | 501 | Железоотделитель шкивной | 2 688,00 | 134,40 |
| 43 | 2336 | Индукционная тигельная плавильная электропечь | 14 868,00 | 743,40 |
| 44 | 2335 | Индукционная тигельная плавильная электропечь | 14 868,00 | 743,40 |
| 45 | 1879 | Камерная низкотемпературная электропечь | 2 394,00 | 119,70 |
| 46 | 3571 | Пылесос В19-101 | 546,00 | 27,30 |
| 47 | 3572 | Пылесос В19-101 | 546,00 | 27,30 |
| 48 | 264 | Смеситель чашечный | 3 822,00 | 191,10 |
| 49 | 2673 | Станок обдирочно-шлифовальный 3К633 | 361,20 | 18,06 |
| 50 | 1110 | Станок обдирочно-шлифовальный 3М636 | 386,40 | 19,32 |
| 51 | 2816 | Станок точильно-шлифовальный 3К633 | 361,20 | 18,06 |
| 52 | 322 | Транспортер вертикальной подачи оборотной смеси | 2 436,00 | 121,80 |
| 53 | 2400 | Установка компрессорная в комплекте с осушителем сжатого воздуха | 7 434,00 | 371,70 |
| 54 | 1080 | Ванна для гальваники (нержавеющая сталь) | 30,00 | 1,50 |
| 55 | 1081 | Ванна для гальваники (нержавеющая сталь) | 30,00 | 1,50 |
| 56 | 1083 | Ванна для гальваники (нержавеющая сталь) | 30,00 | 1,50 |
| 57 | 1089 | Ванна для гальваники (нержавеющая сталь) | 30,00 | 1,50 |
| 58 | 2020 | Установка для сверления бетона Esson D-350 | 1 620,00 | 81,00 |
| 59 | 1674 | Весы электронные крановые ВК-А-10 | 960,00 | 48,00 |
| 60 | 1715 | Сварочный полуавтомат Lincoln Electric Powertec 305C-4R | 2 340,00 | 117,00 |
| 61 | 1784 | Сварочный полуавтомат Lincoln Electric Powertec 305C-4R | 2 340,00 | 117,00 |
| 62 | 2259 | Станок токарно-револьверный 1Г340П | 2 040,00 | 102,00 |
| 63 | | Щетка навесная | 372,00 | 18,60 |
| 64 | 415 | Циркуляционная пила Ц-5 | 588,00 | 29,40 |
| 65 | 1646 | Навесное оборудование – передний отвал для снега НО-79-1 к трактору МТЗ-82 | 510,00 | 25,50 |
| 66 | 2093 | Навесное оборудование – передний отвал для снега НО-79-1 | 510,00 | 25,50 |
| 67 | 543 | Мотопомпа МП 1600 24-02 | 1 980,00 | 99,00 |
| 68 | 520 | Станок фрезерный | 960,00 | 48,00 |
| 69 | 218 | Станок рейсмусовый | 1 320,00 | 66,00 |
| 70 | 4786 | Полуприцеп бортовой МАЗ 975800-2010 | 2 400,00 | 120,00 |
| 71 | | Горелка БГЖ – 1.2 | 1 440,00 | 72,00 |
| 72 | | Теплогенератор ТМ-Ж-5 | 438,00 | 21,90 |
| 73 | | Сушилка «Нива-10» | 41 280,00 | 2 064,00 |
| 74 | | Горелка БГ-2,3 | 4 140,00 | 207,00 |
| 75 | | Горелка БГГ-3,5 | 5 880,00 | 294,00 |
| 76 | | Агрегат для протравливания семян УПС-10 | 960,00 | 48,00 |
| 77 | | Окучник АК-1,6 | 1 380,00 | 69,00 |
| 78 | 1148 | Станок точильно-шлифовальный 3Б634 | 522,00 | 26,10 |
| 79 | 1211 | Станок поперечно-строгальный 7Б35 | 660,00 | 33,00 |
| 80 | 1428а | Станок горизонтально-фрезерный 6т80 | 2 100,00 | 105,00 |
| 81 | 1534 | Выпрямитель сварочный ВДУ-303 УЗ | 252,00 | 12,60 |
| 82 | 2057а | Станок фрезерный универсальный 6Н81 | 900,00 | 45,00 |
| 83 | 2433 | Пресс гидравлический П-6326 | 2 700,00 | 135,00 |
| 84 | 854 | Трансформатор сварочный ВДУ-506 УЗ | 1 260,00 | 63,00 |
| 85 | 1315 | Бетономешалка | 108,00 | 5,40 |
| 86 | 2133 | Дефектоскоп ультразвуковой CTS-9006 | 2 640,00 | 132,00 |
| 87 | 1203 | Инфракрасный термометр | 246,00 | 12,30 |
| 88 | 1807 | Магнитный толщиметр | 660,00 | 33,00 |
| 89 | 819 | Машина разрывная Р-5 | 3 480,00 | 174,00 |
| 90 | 676 | Обдирочно-шлифовальный станок 3Б633 | 378,00 | 18,90 |
| 91 | 1949 | Пирометр Raytek | 186,00 | 9,30 |
| 92 | 4667 | Пирометр термоскопический | 600,00 | 30,00 |
| 93 | 1639 | Сварочный бензиновый генератор WAGT 220 DC HSB | 1 140,00 | 57,00 |
| 94 | 1651 | Сверлильная машина на эл. магнитном основании МС8 | 1 020,00 | 51,00 |
| 95 | 379 | Станок настольно-сверлильный 2М112 | 216,00 | 10,80 |
| 96 | 1246 | Таль ручная | 144,00 | 7,20 |
| 97 | 1298 | Щетка дорожная | 432,00 | 21,60 |
| 98 | 4385 | Компрессор | 960,00 | 48,00 |
| 99 | 4635 | Полуавтомат POWERTEC-300S | 1 320,00 | 66,00 |
| 100 | 4745 | Полуавтомат POWERTEC-305C | 1 920,00 | 96,00 |
| 101 | 4633 | Полуавтомат POWERTEC-360S | 1 260,00 | 63,00 |
| 102 | 4713 | Сварочный полуавтомат POWERTEC-365SAIR | 2 520,00 | 126,00 |
| 103 | 3421 | Станок настольно-сверлильный | 216,00 | 10,80 |
| 104 | 1107а | Станок обдирочно-шлифовальный | 420,00 | 21,00 |
| 105 | 1634 | Электротельфер | 1 080,00 | 54,00 |
| 106 | 1764 | Таль электрическая | 600,00 | 30,00 |
| 107 | 1763 | Таль электрическая | 600,00 | 30,00 |
| 108 | 1762 | Таль электрическая 10312 | 600,00 | 30,00 |
| 109 | 3164 | Компрессор гаражный | 588,00 | 29,40 |
| 110 | 3990 | Емкость для подготовки воды | 9 780,00 | 489,00 |
| 111 | 4789 | Дровокол | 216,00 | 10,80 |
| 112 | 2824 | Станок токарный ФЗС32 | 9 420,00 | 471,00 |
| 113 | 1276 | Вибролоток суточных бункеров | 378,00 | 18,90 |
| 114 | 2337 | Кокильный комплекс для производства отливок из чугуна | 109 410,00 | 5 470,50 |
| 115 | 2338 | Линия розлива кокильного литья | 672,00 | 33,60 |
| 116 | 585 | Машина формовочная | 1 890,00 | 94,50 |
| 117 | 2333 | Смеситель периодического действия | 36 708,00 | 1 835,40 |
| 118 | 207 | Поперечно-строгальный станок 7Д36 | 1 386,00 | 69,30 |
| 119 | 304 | Станок вертикально-сверлильный 2А135 | 756,00 | 37,80 |
| 120 | 342 | Станок вертикально-сверлильный 2С-132 | 924,00 | 46,20 |
| 121 | 385 | Станок универсальный заточной 3Д642Е | 924,00 | 46,20 |
| 122 | 392 | Плоскошлифовальный станок ОШ 40-80 | 2 520,00 | 126,00 |
| 123 | 423 | Станок круглопильный Ц6-2 | 1 344,00 | 67,20 |
| 124 | 561 | Пресс-ножницы (нест.) | 1 638,00 | 81,90 |
| 125 | 798 | Радиально-сверлильный станок 2К 52-2 | 1 974,00 | 98,70 |
| 126 | 822 | Пресс кривошипный К2318А | 1 218,00 | 60,90 |
| 127 | 999 | Пресс кривошипный КД 2124Е | 2 142,00 | 107,10 |
| 128 | 1138 | Станок заточной универсальный 3В642 | 840,00 | 42,00 |
| 129 | 1201 | Станок универсальный фрезерный 675П | 1 260,00 | 63,00 |
| 130 | 1219 | Ножницы листовые НД 3316Г | 2 016,00 | 100,80 |
| 131 | 1220а | Полуавтомат зубофрезерный 5Е32 | 1 848,00 | 92,40 |
| 132 | 1238 | Печь камерная СНО-7.6, 3.1/6-И1 | 882,00 | 44,10 |
| 133 | 1250 | Электроталь Т10432 2 т | 924,00 | 46,20 |
| 134 | 1296 | Станок абразивно-отрезной | 302,40 | 15,12 |
| 135 | 1368 | Обдирочно-шлифовальный станок 3М636 | 630,00 | 31,50 |
| 136 | 1476а | Пресс гидравлический П-6326 | 2 016,00 | 100,80 |
| 137 | 1718 | Пылесос В19-101 | 672,00 | 33,60 |
| 138 | 1719 | Пылесос В19-101 | 672,00 | 33,60 |
| 139 | 4740 | Бесшумная ротационная компрессорная установка CSC-40/8 в сборе с осушителем | 10 332,00 | 516,60 |
| 140 | 1920 | ПерфобиндерCobbind C 20 | 54,60 | 2,73 |
| 141 | 1972а | Станок горизонтально-фрезерный | 924,00 | 46,20 |
| 142 | 2247 | Станок радиально-сверлильный 2К 52-1 | 1 806,00 | 90,30 |
| 143 | 2341 | Станок радиально-сверлильный 2К 52-1 | 1 806,00 | 90,30 |
| 144 | 2531 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 840,00 | 42,00 |
| 145 | 2546 | Станок универсально-заточной 3Д642 | 1 554,00 | 77,70 |
| 146 | 2651 | Пылеотсос ПА 218Б | 420,00 | 21,00 |
| 147 | 2653 | Пылеотсос ПА 218Б | 420,00 | 21,00 |
| 148 | 2656 | Пылеотсос ПА 218 | 390,60 | 19,53 |
| 149 | 3444 | Станок радиально-сверлильный 2К 52-2 | 1 974,00 | 98,70 |
| 150 | 3498 | Станок настольно-сверлильный ОС-15 | 231,00 | 11,55 |
| 151 | 3570 | Пылеотсос В19-101 | 504,00 | 25,20 |
| 152 | 3573 | Пылеотсос В19-101 | 504,00 | 25,20 |
| 153 | 3634 | Печь термической закалки мелких партий деталей (нест.) | 924,00 | 46,20 |
| 154 | 3751 | Станок настольно-сверлильный ОС-15 | 231,00 | 11,55 |
| 155 | 3813 | Станок вертикально-сверлильный МН-25-Н | 882,00 | 44,10 |
| 156 | 1134 | Станок заточной 36922 | 268,80 | 13,44 |
| 157 | 4529 | Полуавтомат сварочный ПДГ-508М | 1 092,00 | 54,60 |
| 158 | 204 | Электросети кабельные | 12 054,00 | 602,70 |
| **Оборудование и иное имущество, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47** | | | | |
| 159 | 1580 | Мармит электрический кухонный сухого нагрева ПМЭС-70КМ | 660,00 | 33,00 |
| 160 | 21500 | Балканкар г/п 3т | 4 800,00 | 240,00 |
| 161 | 1320 | Компрессор CBS 20/8 | 4 800,00 | 240,00 |
| 162 | 1321 | Компрессор CBS 30/8 | 5 640,00 | 282,00 |
| 163 | 1579 | Мармит электрический кухонный сухого нагрева ПМЭС-70КМ-600 | 840,00 | 42,00 |
| 164 | 971 | Установка стоматологическая | 5 400,00 | 270,00 |
| 165 | 1581 | Прилавок-витрина холодильный высокотемпературный | 1 080,00 | 54,00 |
| 166 | 2022 | Стол декоративный | 720,00 | 36,00 |
| 167 | 870 | Бильярд | 480,00 | 24,00 |
| 168 | 687 | Мотор лодочный «Ветерок» 8-М | 120,00 | 6,00 |
| 169 | 976 | Мотор лодочный «Вихрь» 25Р | 198,00 | 9,90 |
| 170 | 1731 | Сверлильная машина на электромагнитном основании МС-4 | 780,00 | 39,00 |
| **Транспортные средства, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47** | | | | |
| 171 | 1092 | Автомобиль ГАЗ 31105 (рег. знак 0777 AI-2) | 420,00 | 21,00 |
| **Оборудование, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, пр-д Октябрьский, 2** | | | | |
| 172 | 449 | Кран-балка г/п 3 т | 792,00 | 39,60 |
| 173 | 162 | Кран-балка г/п 2т | 600,00 | 30,00 |
| 174 | 46 | Кран-балка г/п 3 т | 792,00 | 39,60 |
| 175 | 2461 | Кран-укосина ОПТ-1153 г/п 0,5 т | 720,00 | 36,00 |
| 176 | 1359 | Электротельфер г/п 0,5 т | 408,00 | 20,40 |
| 177 | 570 | Электроталь г/п 3,2 т | 672,00 | 33,60 |
| 178 | 1658 | Таль электрическая Т-10332 г/п 1 т | 552,00 | 27,60 |
| 179 | 1242 | Электроталь Т-10432 г/п 2 т | 552,00 | 27,60 |
| 180 | 244 | Электротельфер г/п 3 т | 624,00 | 31,20 |

**Капитальные строения в следующем составе:**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 181 | **Здание трансформаторной подстанции № 4** (здание специализированное энергетики), инв. номер 250/С-29027, общая площадь 89,5 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, д. 101. **В состав лота входит:** секция шин РУ-10 кВ с КСО-272, секция шин РУ-0,4 кВ с автоматом APU-50, автомат нагрузки А3144, трансформатор силовой ТМ-1000/10, линия электропередачи кабельной напряжением до 10 кВ | 25 972,08 | 1 298,60 |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0156 га для использования под производственную базу | | | |
| 182 | Автостоянка (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. номер 250/С-39504, общ. пл. 3 130 кв. м, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, район ул. Ленинградская, 111. Составные части и принадлежности: площадка, эстакада | 13 560,00 | 678,00 |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,3999 га для размещения автостоянки | | | |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Байрашевский Алик Степанович, 80297117094

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.ipmtorgi.by**,** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (от 1 % до 10 %) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 22.07.2021

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **25.08.2021 в 13.00 по адресу: ОАО «Технолит Полоцк», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101, 2-й этаж, актовый зал** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **20.08.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
6 жніўня 2021 г. № 30 (615)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ПАД ЗНАКАМ ДАВЕРУ



Фота БелТА.

## Сітуацыю з рэабілітацыяй нарка- і алказалежных жанчын, якія адбываюць пакаранне ў выпраўленчых установах, вывучала падчас свайго візіту на Гомельшчыну Наталля КАЧАНАВА. Старшыня Савета Рэспублікі наведала папраўчую калонію № 4 у Гомелі

**Візіт пачаўся са знаёмства з установай, у якой з 1965 года адбываюць пакаранне выключна жанчыны. Яны занятыя на швейнай вытворчасці, займаюцца пашывам самай рознай прадукцыі — ад пасцельнай бялізны да спецвопраткі, а вырабы асуджаных гомельскай калоніі вядомыя не толькі ў Беларусі, але і за межамі краіны.**

Два гады таму ва ўстанове быў адкрыты інтэрнат для сумеснага пражывання асуджаных са сваімі дзецьмі. Тут прадугледжаны ўсе ўмовы, каб маладыя маці змаглі адчуць радасць мацярынства. Інтэрнат разлічаны на сумеснае пражыванне 20 асуджаных — такіх мам, цяпер тут знаходзяцца чатыры такіх маці. Старшыня Савета Рэспублікі высока ацаніла ўмовы, створаныя для жанчын і іх малых.

Сваёй гісторыяй падзялілася адна з асуджаных — Святлана Мякшына. Ёй 23 гады, сама родам з Карэліі. Пра сябе расказвае, што атрымала тэрмін па 328-м артыкуле за наркотыкі, прысуд — восем гадоў пазбаўлення волі. Ужо ў калоніі даведалася аб сваёй цяжарнасці. Была магчымасць, каб родныя прыехалі і забралі яе дзіця, але Святлана вырашыла, што будзе гадаваць сваю дачушку Багдану тут, у калоніі. Праз год заканчваецца яе тэрмін пазбаўлення волі, таму дзіця не прыйдзецца накіроўваць у дзіцячы дом. Для мамы гэта, безумоўна, вельмі важна.

— Прачынацца кожную раніцу і бачыць сваё дзіця, назіраць, як яно пазнае свет, робіць першыя крокі, — ні з чым не параўнальная каштоўнасць, — падзялілася Святлана. Яе тэрмін адбывання пакарання ў гомельскай калоніі быў скарочаны з васьмі да трох гадоў і дзевяці месяцаў, у тым ліку па амністыі. Святлана ў ранейшым жыцці паспела атрымаць рабочую спецыяльнасць кухара-кандытара. Кажа, тут было шмат часу пераасэнсаваць сваё жыццё. Маладая жанчына марыць аб уласнай справе кандытара, калі выйдзе з калоніі. Жадае вярнуцца і гадаваць дачку на Радзіме.

Наталля Качанава пазнаёмілася з усімі жанчынамі, што пражываюць у інтэрнатах са сваімі дзецьмі, пагутарыла з дзяўчатамі, якія трапілі ва ўстанову, не дасягнуўшы паўналецця. Старшыня Савета Рэспублікі ў падарунак Дому дзіцяці папраўчай калоніі № 4 Гомеля перадала кіслародны канцэнтратар. Уласна для малых — цацкі.

Сёння ў Доме дзіцяці знаходзяцца 17 дзяцей. Дарэчы, адно з іх нарадзілася мінулай ноччу. Як адзначылі ва ўстанове, Дом дзіцяці — паўнавартасны аналаг звычайнага дзіцячага садка, дзе кожны малы акружаны клопатам выхавальнікаў і медперсаналу.

Наталля Качанава таксама наведала ўчастак для непаўналетніх. Парламентарый пагутарыла з дзяўчатамі, якія паступілі на дыстанцыйнае навучанне ў ВНУ. Трое асуджаных з Гомеля, Віцебска і Салігорска вучацца на педагога-псіхолага.

стар. 8

З НАГОДЫ

## Спрыяць канструктыўнаму дыялогу

**Наталля КАЧАНАВА павіншавала Ігара Гроса з выбраннем старшынёй Парламента Рэспублікі Малдова.**

«Перакананая, што на гэтай высокай дзяржаўнай пасадзе вы будзеце спрыяць прадаўжэнню канструктыўнага дыялогу заканадаўчых органаў Беларусі і Малдовы, развіццю сяброўскіх зносін і пашырэнню плённага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва на карысць народаў нашых краін», — гаворыцца ў віншаванні.

Наталля Качанава пажадала малдаўскаму калезе моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў у адказнай дзейнасці, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

## Арыентацыя — на айчынную вытворчасць!

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА наведаў СТАА «Белвест», дзе правёў рабочую нараду з кіраўніцтвам прадпрыемства, а таксама азнаёміўся з вытворчай базай і пералікам прадукцыі, што выпускаецца, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.**



— Сёння СТАА «Белвест» з'яўляецца адным з паспяховых беларускіх прадпрыемстваў у сферы вытворчасці і рэалізацыі высакаякаснага скуранога абутку. Агульны аб'ём прадукцыі, якая вырабляецца «Белвестам», дасягае двух мільёнаў пар на год, у сваю чаргу, сезонная абнаўляльнасць асартыменту складае 70—80 %, — адзначыў намеснік Старшыні Савета Рэспублікі.

Ён таксама падкрэсліў, што на прадпрыемстве актыўна распрацоўваюцца і ўкараняюцца ў вытворчы цыкл новыя тэхналогіі, якія дазваляюць значна аблягчыць працу работнікаў. У той жа час, на думку віцэ-спікера верхняй палаты парламента, у працэсе вытворчасці абутку айчынныя арганізацыі павінны істотна павялічыць долю выкарыстання беларускай гарбарнай сыравіны.

Анатоль Ісачанка таксама правёў сустрэчу з працоўным калектывам СТАА «Белвест».

Нагадаем, што раней намеснік Старшыні Савета Рэспублікі наведваў ААТ «Мінскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне», ААТ «Бабруйскі гарбарны камбінат» і РУП «Гродзенскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне».

## Гарызонты «Гарызонту»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ ўзяў удзел у выязной нарадзе па пытаннях выканання даручэння Прэзідэнта, дадзенага ім сёлета 5 студзеня падчас наведвання інавацыйнага цэнтра «Гарызонт».**

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, былі абмеркаваны пытанні, звязаныя з рэалізацыяй праекта «Стварэнне інавацыйна-вытворчага парка» на тэрыторыі холдынга «Гарызонт» у межах вуліцы Куйбышава — праспекта Машэрава — вуліцы Чырвоная — вуліцы Кісялёва.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

**Віктар ЛІСКОВІЧ:**

## «Мы накіраваныя на тое, каб ні адна крытычная заўвага ад насельніцтва не засталася без увагі»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ў канцы мінула тыдня правёў у Слонімскім райвыканкаме асабісты прыём грамадзян і прамую лінію. На пытанні жыхароў рэгіёна таксама адказваў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.**



На працягу дзвюх гадзін на прамую лінію паступіла 13 тэлефонных званкоў, асабіста прыйшлі на прыём тры заяўнікі. Усяго прагучалі 23 пытанні, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Традыцыйна ў Слонімскім раёне большасць пытанняў, якія ўзнімаюцца, датычыліся дзейнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі, працаўладкавання, рамонту дарог, кантролю за дзейнасцю індывідуальных прадпрымальнікаў, якасці аказання медыцынскіх паслуг і іншага.

Падводзячы вынікі прыёму грамадзян і прамой лініі, сенатар адзначыў важнасць падобных выязных мерапрыемстваў і падкрэсліў, што трэба ўважліва ставіцца да просьбаў, з якімі прыходзяць людзі, і максімальна проста і даступна тлумачыць ім, чаму тое ці іншае рашэнне пытання найбольш разумнае і мэтазгоднае.

— Падчас наведвання Слонімскага раёна выслухаў нямала розных пытанняў як індывідуальнага, так і грамадскага характару, якія маглі б быць вырашаны на мясцовым узроўні. Мы накіраваныя на тое, каб ні адзін зварот, ні адна крытычная заўвага ад насельніцтва не засталіся без увагі. Пры гэтым трэба ўнікаць у кожны з іх, каб давесці да лагічнага завяршэння. Безумоўна, ёсць пытанні, якія мы змяніць не можам (напрыклад, судовыя рашэнні), аднак у большасці выпадкаў ёсць магчымасць дапамагчы людзям, — рэзюмаваў Віктар Лісковіч.

У рамках рабочага візіту на Слонімшчыну старшыня профільнай камісіі наведаў таксама Слонімскі дзяржаўны медыцынскі каледж, дзе ідзе ўступная кампанія. Цікавасць да тэмы абумоўлена не толькі профілем камісіі, але і тым, што сенатар сёлета з'яўляецца намеснікам старшыні Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Парламентарый азнаёміўся з арганізацыяй і ходам уступнай кампаніі ў навучальнай установе, наведаў прыёмную камісію і пагутарыў з абітурыентамі. Дарэчы, план набору на бягучы год складае 220 чалавек, 190 з якіх паступаюць на бюджэтнай аснове.

# ПАД ЗНАКАМ ДАВЕРУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Кіраўнік Савета Рэспублікі азнаёмілася з дзейнасцю рэабілітацыйнага цэнтра «Давер», які на тэрыторыі папраўчай калоніі пачаў працаваць з ліпеня бягучага года. Гэта пілотны праект, ён прадугледжвае ізаляванае знаходжанне ў цэнтры 16 асуджаных. Усе яны маюць залежнасць ад псіхаактыўных наркатычных рэчываў і выказалі жаданне прайсці лячэнне і рэабілітацыю. З удзельнікамі праграмы, разлічанай на паўгода, працуюць псіхолагі, выхавальнікі, медыкі.



Інтэрв'ю журналістам пагадзілася даць адна з асуджаных, якая праходзіць рэабілітацыю. Святлане (прозвішча прасіла не называць) — 26 гадоў, родам з Мінска, «на волі» яе чакаюць родныя і пяцігадовая дачка. Да калоніі маладая жанчына вучылася ў архітэктурным каледжы, але, як сама прызнаецца, наркотыкі перашкодзілі развіваць талент і вучыцца далей. Паспрабавала ўсе віды наркатычных сродкаў, пачаўшы «прымаць» у 13 гадоў. Атрымала тэрмін калоніі ў 21 год, на той момант у яе была трохмесячная дачушка.

— Рэабілітацыя дае ўпэўненасць у будучыні, таму што ёсць страх перад вызваленнем — вярнуцца да ранейшага жыцця, а тут гэта, як той казаў, прафілактыка і значны крок у цвярозую будучыню, — упэўненая дзяўчына. — Мы разбіраемся ў прычынах нашых хвароб, вельмі цікава праходзяць заданні, лекцыі, для дзяўчат сапраўды праводзіцца вялікая работа. На кожны дзень тыдня для нас распрацаваны адмысловы план заняткаў, прыязджаюць спецыялісты з рэабілітацыйнага цэнтра «Ключ», праводзяць групавыя заняткі, нам усім вельмі падабаецца.

Расказвае маладая маці і аб умовах пражывання. Кажа, вельмі камфортна, па-іншаму нават сябе адчуваеш, для яе гэта значны этап падрыхтоўкі да таго часу, калі вернецца дадому.

— Я і мае родныя вельмі хацелі, каб я трапіла на рэабілітацыю, каб быць больш упэўненымі і спакойнымі.

Святлане ў рэабілітацыі і перааэнсаванні жыцця значна дапамагае маляванне. Малюе для сябе, здымаючы такім чынам псіхалагічныя праблемы, малюе і для сваёй дачкі, якой дасылае свае работы з калоніі. Мінчанка адбыла ўжо пяцігадовы тэрмін пазбаўлення волі, марыць выйсці праз год умоўна-датэрмінова.

Тым не менш, **намеснік начальніка ўстановы па папраўчай рабоце, кіраўнік рэабілітацыйнага цэнтра «Давер» Алена ЛУКОМСКАЯ** звяртае ўвагу:

— Звыш 40 працэнтаў асуджаных жанчын, якія адбываюць пакаранне ў папраўчай калоніі № 4, пакутуюць ад наркатычнай і алкагольнай залежнасці.

Для праходжання праграмы рэабілітацыі ў цэнтры «Давер» былі распрацаваныя крытэрыі адбору ўдзельнікаў — наяўнасць залежнасці, дастатковы тэрмін для праходжання праграмы, адсутнасць абставін, якія не даюць магчымасці займацца ў праграме, і самы асноўны крытэрый — гэта згода на рэабілітацыю. Адбор сярод асуджаных таксама быў праведзены на падставе псіхалагічнага і медыцынскага абследавання.

Па выніках сустрэчы Наталля Качанава адзначыла, што тыя ўмовы, якія створаны сёння ў гомельскай калоніі для асуджаных, дазваляюць асэнсаваць іх праблемы, стаць на шлях выпраўлення і зрабіць усё, каб працягнуць сваё жыццё годна.

— У сваёй рабоце парламентарыі працуюць над законапраектамі, а для таго, каб вырашаць падобныя пытанні, безумоўна, варта ведаць сітуацыю, якая складваецца ў выпраўленчых установах. Магу адзначыць, што значная колькасць маці, дзеці якіх асуджаныя па артыкуле 328 за ўжыванне і распаўсюджванне наркотыкаў, звяртаюцца да нас і гавораць аб тым, што неахоўна зрабіць, што ўдасканаліць у папраўчай рабоце. Літаральна днямі ў мяне была сустрэча з такімі мамамі, — адзначыла кіраўнік Савета Рэспублікі. Яна звярнула ўвагу, што не так даўно быў праведзены выязны Прэзідыум Савета Рэспублікі сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой менавіта па праблемах наркатычнай і алкагольнай залежнасці. Варта ў дадзеным кірунку вывучаць і вопыт работы рэабілітацыйнага цэнтра ў гомельскай папраўчай калоніі.

— Гэта вельмі важна, бо за гэтым стаяць сем'і, стаяць дзеці. Калі 40 працэнтаў жанчын, якія адбываюць пакаранне гомельскай калоніі, маюць залежнасці, гэта, безумоўна, бяда і з гэтым трэба працаваць. Многія з іх пазбаўленыя бацькоўскіх правоў, іх дзеці выхоўваюцца ў іншых сем'ях ці ў дзіцячых дамах, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Сёння мы сустрэліся з шасцю дзяўчатамі, якія трапілі ў калонію непаўналетнімі за ўжыванне і распаўсюджванне наркотыкаў. Гэта таксама вельмі сур'ёзная праблема, якой павінны займацца наша грамадства, нашы грамадскія аб'яднанні. Усе павінны разумець, што гэта бяда, якая можа прыйсці практычна ў любую сям'ю. На гэта звярталі ўвагу і Прэзідэнт, разглядаліся магчымыя меры па зніжэнні тэрміну пакарання за падобныя артыкулы, і тады былі прынятыя пэўныя крокі ў гэтым кірунку.

Акрамя таго, падчас візіту ў рэгіён Наталля Качанава сустрэлася ў Гомельскім абласным выканаўчым камітэце з дэпутацкім корпусам абласнога і базавага ўзроўняў. Старшыня Савета Рэспублікі на сустрэчы звярнула ўвагу на неабходнасць больш актыўнага ўключэння дэпутатаў у работу са зваротамі грамадзян, важнасці інфармавання людзей аб становішчы ў краіне, каб не дапусціць негатыўнага ўплыву фэйкаў. Акцэнт быў зроблены таксама на актуальнасці і важнасці работы з моладдзю.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота БелТА.**

# Расставіць акцэнты

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дырэктар ААТ «Чырвоны харчавік» Сяргей АНЮХОЎСКІ правёў сустрэчу з працоўным калектывам ААТ «ТАіМ» холдынга «БелаўтаМАЗ».**



Падчас гутаркі парламентарый дэталёва спыніўся на пытаннях знешняга санкцыйнага ціску на Рэспубліку Беларусь, унясення змяненняў у Асноўны Закон краіны, заканатворчай дзейнасці ў парламенце, пераарыентацыі рынкаў збыту беларускай прадукцыі і іншых, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

**Наша даведка**

ААТ «ТАіМ» — найбуйнейшы ў СНД вытворца (пнеўма) тармазных апаратаў і механізмаў для грузавых аўтамабіляў, аўтобусаў, сельскагаспадарчай і прычапной тэхнікі.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

## На кантролі: прыдатнасць для пражывання і якасць абслугоўвання

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік начальніка каардынацыйнага цэнтра «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Марына ІЛЬІНА разгледзела зварот жыхароў дома № 18 па вуліцы Стаханаўскай у Мінску. Пытанні, якія ўзнімалі мінчане, датычыліся бяспекі пражывання ў доме 1947 года пабудовы.**



Сенатар выехала на месца разам з дырэктарам КУП ЖКГ Партызанскага раёна сталіцы. Па выніках сустрэчы з заяўнікамі было прынята рашэнне абследаваць дом з пункту гледжання яго прыдатнасці да пражывання і ўзяць на кантроль пытанне якасці яго абслугоўвання.

Сваё кіно

# Зразумець сваіх, каб не стаць чужымі

**Час ідзе, а чалавечая сутнасць не змяняецца. Асабліва гэта заўважаецца, калі глядзіш кіно, якое здымалі дзясяткі гадоў таму. Кінастужка «Цешча», якая падымае тэму ўзаемаадносін пакаленняў бацькоў і дзяцей, людзей з рознымі поглядамі і характарамі, — не выключэнне. Убачыць яе зможам у гэтыя выхадныя на «Беларусь 3».**

«Цешча» з'явілася на «Беларусьфільме» ў 1973 годзе. Рэжысёрам карціны значыцца Сяргей Сплашноў, які да гэтага зняў фільмы «Зялёныя агні» (1955), «Нашы суседзі» (1957). Спачатку задумвалі і здымалі стужку з Гарнікам Азаранам і маскоўскімі акцёрамі, але потым сітуацыя змянілася (малады рэжысёр не знайшоў паразумення са сцэнарыстам Уладзімірам Фіганавым з-за таго, што ўнёс карэктывы ў першапачатковы сцэнарый) і зрабілі яе ўжо з новай камандай. Тут задзейнічаны Генадзь Гарбук, Стэфанія Станюта, Павел Малчанаў і іншыя. Галоўную гераіню сыграла Таццяна Карпава, роля яе дачкі дасталася Галіне Фядотавай, а кіроўцу Сашу на экране ўвасобіў Аляксандр Удовін.



Сюжэт просты і жыццёвы... У адным са шматкватэрных дамоў Мінска (пачатак 1970-х гадоў) жывуць людзі розных узростаў і характараў. І сярод іх ёсць Клаўдзія Іванаўна, якая вельмі непакоіцца пра будучае сваёй дачкі і яе кар'еру вучонага. Яна бярэ сітуацыю ў свае рукі і разбурае адносіны дзяўчыны з хлопцам Аляксандрам, які працуе шафёрам. Ды і суседзям жанчына не дае спакойна жыць, бо тыя быццам бы перашкаджаюць ёй... Хто ж атрымае канчатковую перамогу ў гэтай схватцы з рэчаіснасцю і яе абставінамі? Убачым 7 і 8 жніўня ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 145

З 20 да 24 ліпеня ў в. Жыровічы (Слонімскі раён) праходзіў XI Міжнародны турнір па шашках-100, прысвечаны Дню вызвалення Слоніма. У галоўным турніры, які сабраў 24 шашысты, перамагла майстар Вікторыя Нікалаева (Мінск). У юнацкім сярод 13 удзельнікаў наймацнейшы быў Уладзімір Чайкоўскі (Гродна).

**№ 87**



№ 87 Уладзімір Ягораў (Расія)

**Белыя простыя шашкі:** c1 ,e1, e3, h4, e5 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a5, g5, d6, f6, h6 (5)

У спалучэнні двух прыёмаў звязкі і ахвяры белыя перамагаюць. Паспрабуйце знайсці шлях да перамогі самастойна.

Наступныя кампазіцыі склаў наш актыўны аўтар, майстар з Латвіі Генадзь Андрэеў.

**№ 88**

**Белыя простыя шашкі:** a3, a5, h6, c7 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** c3, e5, f6, e7, d8 (5)

**№ 89**

**Белыя простыя шашкі:** d2, h2, a3, e3, b4, g5, b6 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** g3, f4, e5, h6, c7, e7, g7, d8 (8)

Яшчэ дзве пазіцыі Генадзь склаў па правілах бразільскіх шашак.

**№ 90**

**Белыя простыя шашкі:** e1, d2, e3, c5, b6, c7(6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, g3, d4, a5, g5, e7 (6)

**№ 91**

**Белыя простыя шашкі:** c1, g1, c3, d4, c5, d6, h6 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, e3, g3, f6, g7, f8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 144 ад 23.07.21.

№ 82 1.g5-f6 e5:g7 2.f2-g3 (h4:f2 3.b6-c7 b8:d6 4.c5:e7 f8:d6 5.h6:g1 a7-b6 6.g1:a7 h2-g1 7.b4-c5 g1:b6 8.a7:c5+)

2... h2:f4 3.b6-c7 b8:d6 4.c5:e7 f8:d6 5.h6:c5 f4-g3 6.c5-d4 g3-h2 +

№ 83 1.e5-d6 e7:c5 2.f4-g5 h2:f4 3.g5:e7 f8:d6 4.e3:g5 c5:c1 5.h6:a3 c1:h6 6.h4-g5 h6:b4 7.a3:a7 a5-b4 8.a7-d4 b4-a3 9.d4-e5 a3-b2 10.e5:a1+

№ 84 1.d6-c7 b8:b4 2.a5:g3 h2:f4 3.e7-d8 f4-g3 4.d8-e7 f8:d6 5.h6:c5 g3-h2 6.c5-g1+.

№ 85 1.46-41 38:49 2.22-17 12:21 3.16:38 49:47 4.30-25 47:20 5.25:01+

№ 86 1.19-14 20:09 2.32-27 21:43 3.48:30 29:47 4.30-25 47:20 5.25:01+

Першыя дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (Магілёўская вобл., Клімавіцкі р-н, в. Уздзевічы).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013.*

*E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**





## ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Раскрываем сакрэты навукі

**Перадача «Навукаманія» — знаходка для тых, каму цікавы свет навукі. Сумесны праект сацыякультурнага тэлеканала Белтэлерадыёкампаніі і Нацыянальнай акадэміі навук кожны панядзелак і суботу знаёміць аўдыторыю з беларускімі даследчыкамі і іх распрацоўкамі, дасягненнямі ў пэўнай галіне, а таксама з унёскам у развіццё сусветнай навукі.**



Падчас семінара дэпутаты таксама прааналізавалі вынікі сумеснай работы арганізацый і органаў мясцовай улады па развіцці турызму на Жлобіншчыне. На прыкладзе работы аграэкасядзібы «Бабуліна хата», размешчанай у вёсцы Лясань Салонскага сельсавета, ацанілі, якія ўмовы створаны для актыўнага адпачынку і прыцягнення турыстаў у раён. Менавіта ў турыстычным кірунку, адзначылі ўдзельнікі семінара, Жлобінскі край у перспектыве можа стаць удалым прыкладам развіцця новых формаў. Напрыклад, магчыма развіваць прамысловы турызм з экскурсіямі на БМЗ. Увогуле патэнцыял для развіцця турызму і сферы паслуг на Жлобіншчыне вельмі значны. Агульныя ініцыятывы, падкрэслілі дэпутаты, толькі ўмацоўваюць яго.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# КАБ НЕ БЫЛО «ВАДЫ РАЗЛАДУ»,

## ці Як работа са зваротамі працуе на апярэджанне

**У Гомельскай вобласці за апошнія пяць гадоў забяспечанасць жыхароў населеных пунктаў якаснай пітной вадой павялічылася з 88 да 94 працэнтаў.**

Такіх паказчыкаў удалося дасягнуць дзякуючы выкананню задач, пастаўленых перад рэгіёнам згодна з дзяржпраграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». Між тым, у вобласці гэты сацыяльна значны стандарт жыццезабеспячэння застаецца пад пільнай увагай адказных ведамстваў.

Так, супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці звяртаюць увагу, што ў асобных населеных пунктах яшчэ застаюцца пытанні да якасці паслуг водазабеспячэння. Скаргі ад грамадзян аб неналежнай якасці пітной вады неаднаразова паступалі на прамыя тэлефонныя лініі, якія арганізоўвае ведамства. Усе звароты былі ўзятыя на кантроль КДК Гомельскай воласці.



— На нядаўна праведзеную ў камітэце «гарачую лінію» звярнуўся 31 жыхар з 9 раёнаў вобласці са скаргамі на якасць пітной вады і адсутнасць стабільнага водазабеспячэння, — паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення кантролю за работай галін гаспадаркі КДК Гомельскай вобласці Анатоль ШЧАРБЕНКА.** — Высветлілася, што ў ліку асноўных прычын агучаных праблем — непрыняцце арганізацыямі ЖКГ мер па замене зношаных сетак водазабеспячэння, правядзенні прамывак сеткі і забеспячэнні неабходнага ціску ў трубаправодах.

Было вызначана, што на працягу мая-чэрвеня бягучага года вада, якая падавалася ў жылыя дамы па вуліцах Крышталаўскай, Беліцкай і Каленікава ў Гомелі мела брудна-карычневы колер і прымесі.

— Гэта вымусіла жыхароў дамоў па названых вуліцах неаднаразова звяртацца на адрас арганізацыі, якая эксплуатуе. Аднак дзейсныя меры па вырашэнні дадзенага пытання выканаўцам паслуг не прымаліся, гідрапрамывкі ўнутрыквартальнай размеркавальнай сеткі не праводзіліся. Толькі пасля звароту на «гарачую лінію» камітэта і прыцягнення да разгляду гэтага пытання мясцовых органаў улады неадпаведнасці былі ліквідаваныя, — падкрэсліў Анатоль Шчарбенка.

У сваю чаргу, па прапанове КДК Гомельскай вобласці мясцовымі выканаўчымі органамі ліквідаваная частка наяўных недахопаў, якія ўплывалі на якасць паслуг па водазабеспячэнні. Усе выяўленыя праблемныя пытанні ўзятыя на кантроль да поўнага іх вырашэння.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Жыллё, дарогі, добраўпарадкаванне



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Аляксей НЯВЕРАЎ правёў прамую лінію і асабісты прыём грамадзян.**

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, звароты датычыліся пытанняў жыллёвага заканадаўства, нездавальняючага стану дарог і прыдамовых тэрыторый, прымянення ч. 4 арт. 328 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь у дачыненні да непаўналетніх.

— Пытанні, якія ўздымалі жыхары рэгіёна на прамой лініі, можна вырашыць на мясцовым узроўні ва ўзаемадзеянні са структурнымі падраздзяленнямі выканаўчай улады. Што датычыцца прыёму грамадзян, то па наяўных фактах трэба дэталёва разбірацца спецыялістам. А ўнесеныя прапановы разгледзім на пасяджэнні камісіі, — пракаментаваў вынікі работы са зваротамі грамадзян парламентарый.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## Як дамовіцца з суседзямі і падзяліць спадчыну

**На мінулым тыдні член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, загадчык натарыяльнай канторы Пінска Ірына САЧКОЎСКАЯ ў грамадскай прыёмнай Пінскай гарадской арганізацыі РГА «Белая Русь» правяла асабісты прыём грамадзян і прамую лінію для жыхароў горада.**

Пінчукі, якія звярнуліся на прыём, прасілі растлумачыць іх правы ў галіне жыллёвых праваадносін, пытанні, якія датычацца сумеснага карыстання жылымі памяшканнямі, правы атрымання ў спадчыну. Так, адной з заяўніц растлумачаны парадак падзелу сумеснай маёмасці па пагадненні бакоў, а таксама ў судовым парадку, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

На прамую лінію таксама звярнулася жыхарка Пінска са скаргай на парушэнне суседзямі правілаў пражывання. Па ўсіх пытаннях былі дадзены тлумачэнні падчас асабістага прыёму.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## Вачыма «першапраходцаў»

### Сенатар узяла ўдзел у адкрыцці выстаўкі беларускіх мастакоў

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны рэдактар «Лідскай газеты» Кацярына СЕРАФІНОВІЧ узяла ўдзел у адкрыцці выстаўкі работ беларускіх мастакоў-авангардыстаў «Першапраходцы-2» з прыватнай калекцыі Яўгена Ксяневіча (дарэчы, гэта наш пастаянны аўтар і вядучы «звяздоўскай» рубрыкі «Песню бярыце з сабой». — Аўт.). Вернісаж адбыўся ў Лідскім гісторыка-мастацкім музеі.**

Сенатар падкрэсліла, што адкрыццё выстаўкі — вялікая падзея ў культурным жыцці горада, і адзначыла, што «Лідская газета» аказвае інфармацыйную падтрымку ўсім мерапрыемствам, якія праходзяць у музеі.

Акрамя таго, Кацярына Серафіновіч перадала ў фонд музея кнігу «У аб'ектыве часу: журналістыка Гродзеншчыны».

КОНКУРС

## «Прававы лайфхак!...»

### Сенатар Віктар ЧАЙЧЫЦ узяў удзел у цырымоніі ўзнагароджання па выніках конкурсу відэаролікаў

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў узяў удзел у падвядзенні вынікаў конкурсу відэаролікаў «Прававы лайфхак! У мяне шчаслівае дзяцінства — гэта маё права». Мерапрыемства прайшло ў «Белтэлерадыёкампаніі», паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.**

Ініцыіраваў і арганізаваў конкурс Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Беларуская рэспубліканская калегія адвакатаў стала адным з суарганізатараў. Усяго было пададзена 293 заяўкі, пераможцамі сталі 17 работ. Крэатыўныя ідэі дзеці з усёй краіны прадставілі ў выглядзе лайфхакаў: паказалі, як атрымліваць прававыя веды і рэалізоўваць свае правы і абавязкі.

Сенатар узнагародзіў пераможцу ў намінацыі «Прававое выхаванне» і адзначыў работу «МАЁ правa» Лукашэнкі Маргарыты з аграгарадка Куранец Мінскай вобласці.

Парламентарый падкрэсліў важнасць удзелу маладога пакалення беларусаў у прававым выхаванні: «Гэта вялікая дапамога адвакацкай супольнасці і ўсім, хто займаецца прававым выхаваннем, бо часам дзеці і падлеткі больш зважаюць стараннi і прыслухоўваюцца да аднагодкаў, чым да старэйшага пакалення. А нам усім (і дарослым, і дзецям) важна жыць шчасліва, у міры і згодзе толькі тады магчыма, калі ўсе ведаюць і выконваюць свае правы і абавязкі».

СТАРТЫ-2021

# Спорт як сімвал адзінства

### Дэпутаты Магілёўскай вобласці вызначылі наймацнейшых, найхутчэйшых і найспрытнейшых

**ЛЕТАСЬ летнюю Спартакіяду дэпутаты Магілёўскай вобласці адклалі з-за пандэміі, але сёлета правялі яе з яшчэ больш высокім запалам і азартам. Нават назва кажа за сябе — «Хутчэй! Вышэй! Мацней! Разам!» Удзельнікі наглядна дэманстравалі бадзёры дух згуртаванасці і сяброўства, які асабліва актуальны ў Год народнага адзінства. Сімвалічна, што дата правядзення Спартакіяды — 24–25 ліпеня — практычна супала з адкрыццём Алімпійскіх гульняў у Токіа. Як жартуюць самі дэпутаты, гэта не яны, а да іх прымеркавалі вялікае міжнароднае спартыўнае мерапрыемства. Маўляў, штогадовыя летнія Спартакіяды ўжо па традыцыі праводзяцца ў вобласці ў канцы ліпеня. Але калі сур'ёзна, такое супадзенне толькі натхніла народных абраннікаў.**





Месцам правядзення спаборніцтваў стаў Быхаў. Усё пачалося з урачыстага пастраення на пляцоўцы каля раённага фізкультурна-аздараўленчага цэнтра. Удзельнікаў натхнілі на добрыя вынікі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Людміла Здорыкава, Наталля Тарасенка і Вера Шырокая (апошняя выступіла ў складзе каманды з Бабруйска). З прывітальным словам выступілі намеснік старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына Раінчык і старшыня Быхаўскага райвыканкама Дзмітрый Марціновіч.

Спаборніцтвы праводзіліся па лёгкай атлетыцы, эстафеце, настольным тэнісе, шашках, валейболе. Акрамя таго, вызначаліся наймацнейшыя ў конкурсе «Трапны футбаліст», індывідуальным першынстве па скачках на скакалцы і падцягванні на турніку. Нягледзячы на тое, што ўдзельнікі не прафесіянальныя спартсмены, адчувалася, што са спортам яны сябруюць. Воля да перамогі і падтрымка таварышаў па камандзе рабілі цуды. Кожны стараўся прадэманстраваць свае максімальныя магчымасці і ўстанавіць своеасаблівы рэкорд.

У выніку пераможцам летняй Спартакіяды-2021 стала каманда Клічаўскага раёна, другое месца занялі прадстаўнікі Чавускага раёна, трэцяе — у крычаўлян. Урачыстая цырымонія ўзнагароджання, дзе найлепшым уручылі кубкі, медалі, граматы, прызы, адбылася ў маляўнічай мясціне — урочышчы «Дубкі».

— У нашай камандзе было дзевяць спартсменаў і шэсць артыстаў — усе паказалі сябе на вышыні, — падзяліўся акалічнасцямі спартакіяднай барацьбы **старшыня Клічаўскага райсавета Уладзімір КНІГА.** — Юрый Чыжонак і Алена Болак прынеслі нам першае каманднае месца ў настольным тэнісе, Кацярына Кедзіч і Уладзімір Абросімаў сталі другія па лёгкай атлетыцы, а нашы тройкі дэпутатаў выйгралі камандную барацьбу ў эстафетных гонках. У шашках нам не пашчасціла, але гэта ўжо не паўплывала на агульны вынік. Затое ў скачках на скакалцы наша Любоў Талочка стала другой, а Уладзімір Абросімаў паказаў найлепшы вынік у падцягванні на турніку: яго рэкорд — 27 разоў! Нашы артысты таксама не падвялі і заваявалі дыплом «За захаванне традыцый». Прыемна, што ў апошнюю зімовую Спартакіяду, якая праводзілася ў 2020 годзе, мы таксама былі першыя. І вось другая перамога запар. Усё гэта сведчыць пра тое, што мы надаем спорту вялікую ўвагу.



Фота з архіва Магілёўскай абласной асацыяцыі.

Па традыцыі, пасля спартыўных стартаў адбыўся канцэрт. Яго змест таксама быў прысвечаны Году народнага адзінства.

— Удзельнікі праявілі згуртаванасць і волю да перамогі не толькі ў спартыўных спаборніцтвах, але і ў творчасці, — заўважыла **выканаўчы дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Паліна ЦЕРАШКОВА.** — Камандны дух і адзінства, уласцівыя кожнай камандзе, вельмі выразна выявіліся ў конкурсе мастацкай самадзейнасці.

**Старшыня Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН** таксама высока ацаніў арганізацыю мерапрыемства.

— Яна прайшла нават з большай колькасцю ўдзельнікаў, — адзначыў ён. — Нашай камандзе крышачку не хапіла балаў для першага месца, але і другое — гэта вельмі ганарова. Перамаглі сяброўства і адзінства. Галоўнае, што мы з карысцю правялі час. Была добрая магчымасць не толькі паспаборнічаць, але і абмяняцца карыснай інфармацыяй па надзённых пытаннях. Тэма сяброўства і адзінства прайшла чырвонай ніткай праз усё мерапрыемства. На канцэрце гучалі песні пра любоў да краіны, да свайго народа. Менавіта мы, як дэпутаты, прадстаўнікі ад народа, сёння павінны аб'ядноўваць людзей, вырашаць іх праблемы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 5 жніўня 2021 года.




# Еду! Еду!

## Ні дарогі, ні следу...

Гэта, як спявалася некалі, «было нядаўна, гэта было даўно». Нас, студэнтаў педінстытута, адправілі на цаліну, на ўборку пшаніцы. Ураджай яе, прычым вельмі багаты (мы такіх і не бачылі), звозілі з палёў на ток, там жа перасушвалі і адпраўлялі далей — на элеватар у горад Жаксы. Студэнты і шафёры працавалі кругласутачна і пазменна. А студэнткі ў свае «адгулачныя» дні моду завялі — падсаджваліся ў машыны, ездзілі ў горад, каб там пахадзіць па крамах і потым (часам з пакупкамі) — вярнуцца назад.

Жаданні дзяўчат былі зразумелыя, аднак не ўсе, бо, напрыклад, мы з аднакурсніцай Томай проста жах як хацелі навучыцца кіраваць... самазвалам.

З гэтай мэтай неяк напрасілістя ў кабіну да вясёлага дзядзечкі (яны, дарэчы, з ахвотай бралі гаваркіх пасажыраў, каб па дарозе — пад сотню вёрстаў! — крый бог, не заснуць), заехалі з ім у горад, не без таго — пабегалі па крамах, а на зваротным шляху, што называецца, агучылі мару. Дзядзечка чамусьці не здзівіўся, наадварот — з ахвотай паказаў, што трэба пакруціць і на што нагой націскаць, каб паехаць, як руль у дарозе трымаць... Пад яго наглядам мы нават «парулілі» — па чарзе, па стэпе! А ён — трэба сказаць — ляжаў там паўсюль, да самага гарызонту! Дарог — ніякіх: добра, калі нейкі след — ад папярэдніх машын. Нягледзячы на гэта...

Помню той дзень — нібы ўчарашні! На дварэ, значыць, спёка. І ў нас — абедзенны перапынак. Падчас яго ўсё жывое (і ўсе жывыя) на дзве гадзіны спаўзаюць у цень.

Я таксама «спаўзла» і адтуль — у шэрагу іншых машын — убачыла знаёмую, можна сказаць, «сваю». Вясёлага дзядзечкі-шафёра пры ёй не было (як не было нідзе і нікога). А таму я (дзіцячыя мазгі!) мігам апынулася на сядзенні, завяла самазвал і — ад шчасця аж дух заняло! — паехала! Спачатку нясмела, памалу, потым — трохі хутчэй і яшчэ хутчэй!..

Адкуль на маім «шляху» ўзяўся «газік» па мянушцы «казёл», шчыра кажучы, я не заўважыла. Аднак з яго кабіны ўжо выскачыў нейкі мужчына, патрабавальна замахаў рукамі — загадаў спыніцца.

Паспрабавала ўспомніць, як гэта робіцца, і не паспела: дзядзька нейкім чынам апынуўся ў кабіне, выхапіў руль «майго» самазвала, стаў кіраваць ім ды рознымі словамі бэсціць шафёра: пагражаць, што пакажа яму, дзе ракі зімуюць, што пагоніць з работы, пазбавіць прэміі...

Я ледзьве не плакала: бажылася, што шафёр тут ні пры чым, што я сама, без яго ведама, села ў машыну, што караць тут трэба толькі мяне! «Цябе бог пакарае, — агрызнуўся дзядзька. — Вось народзіш трайню і тады ўспомніш!»

...Да родаў адтуль, з цаліны, было як да неба.

А ў той дзень я ўбачыла толькі адно: калі бог каму хоча дапамагчы, ён абавязкова нешта зробіць, прышле чалавека на выручку.

Не ведаю, як далёка я тады б заехала (разварочвацца яшчэ не спрабавала)? Не ведаю, што рабіла б, калі б раптам скончыўся бензін, у самазвале нешта зламалася б ці ўсчалася якая бура? Стэп не даруе бяздумнасці. Але мне, дзякуй богу, пашчасціла.

**Зоя Наваенка,**

*г. п. Падсвілле,*
*Пастаўскі раён.*

# Страшней за пеўня звяроў няма.

## Ну хіба што... казёл?

Памятаеце, у дзядулі Крылова: «У сильного всегда бессильный виноват...»

Між іншым, спрэчная выснова, бо, здараецца, што слабы ўмомант паставіць на калені моцнага. Ды яшчэ і плакаць не дасць! Ну вось вам прыклад.

Мой знаёмец Анатоль набыў сабе шчаня нямецкай аўчаркі. «Падрасце — ахоўнікам будзе», — казаў усім. (Я таксама скажу — па сакрэце: у Таляна ёсць, што ахоўваць)...

І праз нейкі час, як выглядала, з'явілася каму, бо тое шчаня на добрых харчах вельмі хутка ператварылася ў сапраўднага ваўкалака! Адным відам сваім мінакоў палохала... А гаспадар яшчэ і папярэджанне да варот прыбіў: асцярожна, маўляў, сабака добры, толькі нервы ў яго слабыя.

Што, між іншым, чыстая праўда, бо адночы...

Нясе, значыць, Талян харчы свайму ваўкалаку, ставіць міску каля яго будана — чакае, пакуль сабака выйдзе.

А тым часам да яго міскі певень падлядзеў. І пачаў дзяўбсці...

Сабака, абражаны гэтым нахабствам, куляй да птушкі...

Думаеце, яна спужалася і наўцёк? Не! Яна з усёй сілы дзеўбанула «немчука» ў яго высока задраны нос.

Што было потым?

Вясковую ціш парушыў жаласны енк: Таланаў ахоўнік баязліва падціснуў хвост і схаваўся ў свой будане, каб залізваць раны. А яны, трэба сказаць, былі не толькі фізічныя, але і псіхалагічныя. Ва ўсякім разе, пры кожным кукарэканні гаспадарскага ці суседскага пеўня сабака яшчэ доўга ўцякаў хавацца...

Але ж з байкі я пачаў гэтую гісторыю, байкай і скончу. Гадоў колькі таму расійскія каналы паказвалі рэпартажы з заапарка пра незвычайнае сяброўства паміж тыграм Амурам і казлом Цімурам. Адгукнуўся на гэту падзею і я:

*Вось дзівосы дык дзівосы:*
*Тыгру сябрам стаў казёл,*
*Пазайздросціць можна лёсу,*
*Глянь, што робіцца наўкол —*
*Па сусветнаму закону*
*Моцны душыць небарак,*
*Можа, той казёл шалёны,*
*Што яму шанцуе так?*
*Ці то з тыграм непарадкі,*
*Што такая дур найшла?*
*Знай, тыгрыныя нашчадкі*
*Не пахваляць за казла.*
*І, вядома, выйдзе бокам*
*Паласатаму любоў,*
*А казёл*
*глядзіць звысоку...*
*Не іначай — цар звяроў?!*

*... Часта так бывае з намі,*
*Шмат не буду гаварыць.*
*Што жывеш вось так з казламі —*
*І нічога не зрабіць.*

**Генадзь Мішчук,**

*в. Вотчына,*
*Маларыцкі раён.*

# Люстра для Любы

...З чаго пачаць? Мо з таго, што еду я неяк у гарадскім аўтобусе і ад няма чаго рабіць людзей разглядаю. Бачу маладую дзяўчыну ў навушніках (відаць, слухае музыку з дарагога айфона), побач з ёй — з дзявочым заплечнікам — «пані трошкі ў гадах», насупраць — маж-ная-мажная бабуля з унукам гадоў сямі, які з зайздрасцю паглядае на той айфон.

— Дзіцятка, нам у паліклініку трэба, — кажа бабуля яго ўладальніцы. — Падкажы, дзе лепей выйсці? На гэтым прыпынку?

— Зараз пагляджу, — слізгаючы пальцам па экране мабільніка, абяцае дзяўчо.

Аўтобус тым часам збаўляе хуткасць — набліжаецца да прыпынку.

— Бабуля, пайшлі! — загадвае ўнук. — Учора мы тут выходзілі!

— З наступнага прыпынку будзе бліжэй, — спыняе іх «пані» з заплечнікам.

— Не, вам тут выходзіць! — паведамляе дзяўчо, праклаўшы маршрут на электроннай карце.

Але ж дзверы аўтобуса ўжо амаль зачыніліся!..

Ад'язджаючы ад прыпынку, я са шкадобай паглядзела на бабулю з хлопчыкам, якія ледзьве паспелі выйсці, і ў чарговы раз падумала, чаму (нават ведаючы нешта!) мы шукаем чужых парад? І за іх жа потым трымаемся...

Гэта я кажу не толькі пра іншых, але і пра сябе. Ну вось мяркуйце самі.

Сёлета я зрабіла рамонт у зале, і не сама, як звычайна, а рукамі прафесійнага майстра. Знайшла, наняла і, здаецца, не прагадала: ён бездакорна выраўнаваў сцены, паклаў ламінат, пакleіў дарагія шпалеры...

Факт, што старая люстра да гэтага ўсяго, мякка кажучы, не пасавала, і таму іншага выйсця не было: я накіравалася ў найбліжэйшы гандлёвы цэнтр, каб купіць там прыгожы сучасны свяцільнік.

Мая сяброўка Люба, не раздумваючы, пайшла са мной.

...Гэта вельмі рэдка бывае, аднак люстру — маю! — я ўбачыла здалёк і адразу ж уявіла, як гарманічна яна «ўпішацца» ў інтэр'ер абноўленай залы, як будзе свяціць...

— Вось гэтая?! Фу-у! — скептычна скрывілася Люба, зірнуўшы на люстру. — Ды яна ж падобная на старую... Пайшлі далей — я там іншую бачыла, проста суперсучасную! Вунь яна... Паглядзі!

Сяброўка паказвала рукой на круглае металічнае вечка з дробнымі дзіркамі пад адмысловыя лямпачкі. Яны дружна выпраменьвалі сіняе святло, ад якога тут жа ўзнікала цьмянае адчуванне трывогі. Металічныя пікі, падобныя на лёзы нажоў, і дзіркі ў крузе, што нагадвалі цэнтрыфугу пральнай машыны, толькі ўзмацнялі яе. Але...

Вы здагадаліся: цяпер гэта суперсучасная «цэнтрыфуга» вісіць у нашай зале. Гледзячы на яе, я кожны раз даю сабе слова ўсе больш-менш значныя пакупкі рабіць самастойна.

Што Люба?

Яна па-ранейшаму часта заходзіць да нас, па-ранейшаму любуецца люстрай — нахвальвае сябе за выбар. Ну і мяне — за пакупку.

**Наталля Шастакова,**

*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## Неасабісты суб'ектыў



# МАЎЧАННЕ КАЦЯНЯТ

## Мы павінны гэта пра сябе ведаць

Я, шчыра кажучы, сумнявалася, ці змагу пра тое напісаць, ці патрэбна пра тое пісаць увогуле. Бо гэта не ўкладваецца ніяк, ні ў якія рамкі чалавечыя, нават прыблізна. Але ўсё ж вырашыла, што варта. Мы павінны гэта самі пра сябе ведаць. Папярэджваю: асабліва ўражлівым лепш не чытаць. Шок-кантэнт — літаральна.

У лідскай ветлячэбніцы ўрачы спрабуюць выратаваць коціка Цімошу. Цімоша — звычайнае кацяня-падлетак, шэра-паласаты, з белымі лапкамі і шыйкай. У коціка знявечана ўся задняя частка цела, там няма жывога месца, усё сіне-чорнае. Калі ветэрынары пагалілі яму жывот, каб агледзець, — жахнуліся: там выразна былі відаць чалавечыя пальцы. На гэтым жах не скончаецца — урачы зрабілі выснову, што жывёлку... згвалцілі. А пальцамі да чорна-сіняга трымалі, каб не вырвалася.

Валанцёры прывезлі Цімошу з Навагрудка. Кажуць, што да зверства (хоць зверствам гэта называць няправільна — звяры на такое няздольныя), хутчэй за ўсё, маюць дачыненне мясцовыя падлеткі, нават ёсць падазрэнне, хто менавіта ўчыніў такі здзек з жывёліны. Нераўнадушныя людзі, як толькі медыкі выдадуць заключэнне, будуць звяртацца ў міліцыю. Я асабіста вельмі спадзяюся, што вінаватых знойдуць і пакараюць. Не толькі з-за таго няшчаснага коціка (урачы кажуць: відаць па ўсім, быў свойскі), якога ж, пэўна, падазвалі, гладзілі, а ён даверліва муркаў і тыцкаў лобікам у далонь... Калі іх не знойдуць і не пакараюць, наступнай ахвярай — безабароннай, якая не можа сказаць і даць адпор, — можа стаць чыёсьці дзіця. І тады ўсе страпянуцца і пачнуць разважаць, калі, у які момант звычайны чалавек стаў монстрам, што раптам шчоўкнула ў яго галаве, чаму ніхто не заўважыў. Толькі разважаць ужо будзе позна.

ХТОСЬЦІ скажа: а і сапраўды, навошта яна гэта піша? Выпадак жудасны, але ж тое выключэнне, а не правіла, можа, у чалавека з псіхікай не ўсё ў парадку... Што ж, калі гэта і так, то сярод нас псіхічна хворых, асабліва небяспечных для грамадства людзей нашмат больш, чым мы думаем. Варта толькі падпісацца хоць на адзін валанцёрскі чат, праз які займаюцца выратаваннем жывёлін, каб у гэтым пераканацца — і жахнуцца.

Памятаеце Малыша, сабаку, якога жывым закапалі ў Старобіне? Заведзена крымінальная справа, але вінаватыя дагэтуль не знойдзены. Ходзяць, радуюцца жыццю і ўласнай беспакаранасці... Нядаўна пад тым жа Навагрудкам у лесе знайшлі шчанюка хаскі, вельмі напалоханага. Казалі, што, магчыма, сабачку сцягнула ў лес якая ліса. Але ж чаму менавіта пры набліжэнні любога чалавека (чалавека, не звера!) у Хасанчыка (так яго назвалі) здараліся такія панічныя атакі, што няшчасная істота аж заходзілася, скуголячы... У Гродне на Вішняўцы выпадкова знайшлі прывязанага да дрэва знясіленага кітайскага чубатага. Калі хто не ведае — гэтыя смешныя з выгляду сабакі амаль лысыя, а на вуліцы тады было больш за трыццаць градусаў. У жывёлкі быў моцны стрэс і — галоўнае — яна панічна баялася людзей. Хто ведае, што з ёй вытвараў той, хто пасля пакінуў яе прывязанай у лесе...

А нашай вуліцы ў Сухараве на слупах вісяць вывявы 20-гадовага хлопца з папярэджаннем: «Асцярожна, небяспечны садыст!» Ён бярэ (хацела б напісаць «браў», але няма такой упэўненасці) катоў, якія ўладкоўваюцца «ў добрыя рукі» па аб'явах, а пасля жывёліны бясследна прападаюць. Пра яго ў праграме «Беларуская часінка» на канале «Беларусь 1» у студзені нават быў зроблены цэлы сюжэт. Валанцёрка Людміла падрабязна расказвала і пра зніклых жывёл, і пра суседзяў, якія чулі кацінія крыкі, і пра заяву ў міліцыю. І пра тое, што хлопец прызнаўся ў тым, што загубіў як мінімум дзевяць кацiных жыццяў. Ён здзекваўся з іх, біў, а калі ахвяры гінулі, выкідваў іх у смеццеправод ці з балкона ўніз... Прайшло паўгода, і валанцёры пачалі расклейваць гэтыя аб'явы. Выходзіць, недавярак дагэтуль не пакараны? Я цяпер насцярожана ўзіраюся ў твары ўсіх маладых людзей каля свайго дома. Ведаць, што зусім побач жыве забойца — адчуванне не вельмі прыемнае. Ён жа не забівае людзей? А хто сказаў, што тут недарэчнае слова «пакуль»?..

ТУТ яшчэ можна паразважаць і пра адмысловы закон аб абароне жывёл, які ў нас дагэтуль не прыняты, і пра тое, што ўвесь свет звар'яцеў апошнім часам — і таму што тут дзіўнага, калі зусім побач людзей збіваюць да смерці... Гэта ўсё, вядома, важна. Але падобныя разважанні — гэта, выбачайце, філасофія. А тое, пра што напісала вышэй, адбываецца тут і цяпер. З намі — такімі талерантнымі, высакароднымі, гатовымі падставіць плячо і працягнуць руку дапамогі (і не шукайце ў маіх словах іроніі, яе тут няма, бо яно сапраўды так і ёсць). Але тое, пра што напісана вышэй, — гэта таксама пра нас, і таксама — праўда. Можа, менавіта разуменне, а не адмаўленне гэтага і ёсць першы крок да таго, каб падобнага з намі не здаралася?

УЧОРА, прачытаўшы пра Цімошу, пагля дзеўшы фота з клінікі, наплакаўшыся, не ведала, чым пачаставаць і як прылашчыць сваю кошку. Я гладзіла яе, цалавала, заглядала ў вочы — прасіла прабачэння ва ўсіх іх за ўсіх нас. Ці палягчэла мне на душы? Не ведаю. Яна ж не сказала мне, што дарує...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# СЦЕЖКАМІ

## або Якія сакрэты мае

**Тут знаходзіцца Рака багоў (Ясельда), падзямеллі старажытнага храма, захоўваюцца ўнікальныя гаворкі і традыцыйная культура ды ці не за кожным населеным пунктам стаіць багатая гісторыя і цікавыя паданні. Такое ўражанне выклікае новы турыстычны маршрут «Дарогамі Палескага Загароддзя», што быў прэзентаваны ў рамках выязнога семінара, які правялі Нацыянальнае агенцтва па турызме і Упраўленне спорту і турызму Брэсцкага выканаўчага камітэта, дзе прысутных азнаёмілі з турыстычным патэнцыялам Драгічынскага, Іванаўскага і Пінскага раёнаў.**
**Такая вандроўка раскрывае Беларусь па-новаму: праз чароўныя гісторыі, спевы мясцовых калектываў, багатую архітэктурную і культурную спадчыну, а яшчэ праз шматлікія знаёмствы з людзьмі, якія робяць усё магчымае для захавання «аўтэнтыкі», дазваляе зазірнуць у храмы і пачуць расповеды святароў, паўдзельнічаць у майстар-класах, дэгустацыях. Гэта падарожжа для тых, хто хоча лепш пазнаць нацыянальны характар і (я запазычыла выраз у распрацоўшчыка маршруту — старшыні Пінскага аддзялення экскурсаводаў Тацццяны Хвагінай) «не выкалупваць разынкі, а вывучаць гісторыю ў комплексе». На працягу ўсяго падарожжа да ўдзельнікаў семінара далучаліся мясцовыя даследчыкі і музейшчыкі, каб адкрыць новыя палескія цікавосткі. Гэта край, які здольны ўразіць, змяніць свядомасць і, вядома, улюбіць у сябе. Дазвольце ж пазнаёміць і вас хоць бы з некаторымі палескімі сакрэтамі.**





## А БЭЗ ДЗЕ Ж?

Прыгожыя раслінныя выявы ў вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна можна сустрэць на адзенні, рушніках, царкоўных харугвах. У многіх хатах да гэтага часу захоўваюцца і вышытыя карціны, часта на іх красуецца бэз. Расказваюць, што даўней адзін хлопец заўжды прыходзіў з бэзам да сваёй каханай. Аднойчы ён прыйшоў без запаветнай галінкі, і тая здзівілася: «А бэз дзе ж»? Маўляў, адсюль і назва. І хто б мог падумаць, што ў мясцовы Музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» будуць ехаць людзі з усяго свету, а на народныя святы накшталт Купалля і Каляд збірацца да 1,5—2 тысяч чалавек, што адным з брэндаў мястэчка стане частка жаночага касцюма. Хоць насамрэч тутэйшыя фартушкі сапраўды незвычайныя — яны больш шырокія і кароткія, чым у іншых кутках Беларусі, багата і прыгожа аздобленыя. Без іх ніводная гаспадыня раней не выходзіла на ганак, і толькі святочных фартушкоў магла мець каля 12. А яшчэ тут умелі рабіць асабліва тонкую далікатную тканіну. Нават правяралі якасць яе нітак пры дапамозе пярсцёнка — іх праз яго павінна было прайсці адразу 300 штук. Пра ўсе этапы апрацоўкі льну — а тут былі свае сакрэты, каб атрымаць надта тонкія ніткі — распавядуць у музеі і нават пакажуць, дадуць праверыць свае здольнасці за верацяном ды ткацкім станком. Як лён выспяваў, як яго вырывалі з коранем, вымочвалі, высушвалі, прыбіралі насенне, пераціралі, трапалі, вычэсвалі — і з кожным этапам апрацоўкі ён рабіўся ўсё мякчэйшы. А пад канец бездзежскія гаспадынькі яшчэ часалі яго спецыяльным грэбнем. І толькі ўжо з якаснай кудзелі пралі. Каб адбяліць тканіну, яе складвалі ў жлукту, засыпалі бярозавым попелам, залівалі кіпенем, пакідалі на ноч, а пасля везлі да ракі выпалоскваць. З кожнай такой працэдурай рэчы станавіліся больш белыя. Далей гаспадыні шылі пад сябе адзенне, аздаблялі яго вышыўкай, карункамі. У калекцыі бездзежскага музея каля 360 фартушкоў, і вы не знойдзеце двух аднолькавых! Дарэчы, самы стары з іх — з 1880 года.

Таксама ў музеі вы даведаецеся, як выглядала бездзежская хата, як зачыняліся дзверы, як пры дапамозе духа (спецыяльнае плецёнае прыстасаванне) лавілі рыбу і нават зможаце прымераць традыцыйнае вясельнае ўбранне маладых, а таксама знакаміты плецены з паперы вяночак нявесты — паву. А яшчэ вас могуць запрасіць на майстар-клас па народных танцах, пазнаёміць з абрадамі, пачаставаць макухай (прыпраўай з ільнянога семя). Цікава, што ладзяцца экскурсіі на мясцовай гаворцы.

У 2009 годзе музей атрымаў дыплом за захаванне ўнікальнай калекцыі дыялектаў і абрадаў. І гэта стала штуршком для далейшага развіцця ў дадзеным кірунку — пры ім запрацавала вясковае падвор'е з птушнікам, сажалкай, млыном, катаннем на санках і нават уласнай гасцініцай-хатай.



## ВЯРТАННЕ ЕВАНГЕЛЛЯ

У Свята-Троіцкай царкве айцец Генадзій падзяліўся яшчэ некалькімі сакрэтамі мястэчка. Так, бездзежскі храм будаваўся ў здзітаўскай пушчы, перавозіўся сюды на конях і валах і быў асвечаны ў 1784 годзе. Такім чынам з'явілася трэцяя пабудова на гэтым месцы: першы храм, створаны ў 1622-м, згарэў падчас Паўночнай вайны. Мястэчка было шматлюднае, толькі пасля будоўлі чыгункі яго пачалі «абганяць» іншыя населеныя пункты, якім пашчасціла размясціцца бліжэй да транспартных шляхоў. Але царкоўныя кнігі паказваюць, што яшчэ сто гадоў таму ў Троіцкага і Нікольскага храмаў Бездзежа было 4296 прыхаджан, а ў Драгічыне, напрыклад, на той час жыло каля 700 чалавек. Пры храме існавала вялікая бібліятэка, і да гэтага часу тут захаваліся стражытныя кнігі, самая старая — з 1783 года, ёсць і часаслоў, якому 220 гадоў. Расказаў айцец Генадзій і гісторыю тутэйшага Евангелля. У вайну жыхароў мястэчка сагналі на плошчу для ліквідацыі, але айцец Віктар, які тады тут служыў, чалавек высокаадукаваны, з веданнем некалькіх моў, паклікаў у царкву нямецкага афіцэра. У наступным афіцэр згадваў, што яму нічога не каштавала расстраляць свяшчэнніка, але нешта яго спыняла. Калі яны выйшлі з царквы, афіцэр даў каманду зняць ачапленне і адпусціць людзей. Хоць жыхароў іншых вёсак немцы не пашкадавалі. А ўвечары бацюшка аддаў таму афіцэру каштоўныя залатыя рэчы з храма — так адкупіўся за захаваных жыцці. Гадоў з дзесяць таму на замежным аўкцыёне было выстаўлена Евангелле з пазнакай бездзежскага храма. Каштоўнасць удалося вярнуць, а разам з тым стаў вядомы і працяг той «адкупной» гісторыі. Нямецкі афіцэр доўга ўспамінаў Бездзеж: і размову з бацюшкам, і мясцовую дзяўчыну Еўдакію, якую сустрэў пасля выхаду з царквы, надта падобную да яго памерлай жонкі Евы.

Расказаў айцец Генадзій і пра абрад «Стрілка», які ладзілі ў Бездзежы на Вялікдзень, пасля хрэснага ходу праводзілі абрад з карагодамі, скокамі, барабанамі.



## ШУКАЛЬНІКАМ ПРЫГОД

Па Драгічынскім раёне можна пракладваць самыя розныя маршруты: тут ёсць аб'екты, звязаныя з ваеннай гісторыяй, яўрэйскай тэматыкай, развіваецца спартыўны турызм, чакаюць байдарачнікаў на водным шляху. Варта ўбачыць адзін з пунктаў Дугі Струвэ, прызнанай спадчынай ЮНЕСКА, альбо заехаць у заказнік «Званец» ці ў Брашэвіцкае лясніцтва, паглядзець на аленяў і пагуляць па дэндрапарку, у якім расце адзінае ў Беларусі дрэва карыі авальнай і саджанец з жалуда ад тысячагадовага чарэшчатага дубу, прывезены з Германіі.

Шукальнікаў прыгод уразяць мясціны, дзе засталіся рэшткі Тараканскага манастыра — некалі аднаго з самых прыгожых і значных храмаў на беларускіх землях: 14 патрыярхаў падпарадкоўваліся яму. Спачатку гэта быў праваслаўны, а пасля ўніяцкі храм, а калі «ўнія» на тэрыторыі Расійскай імперыі была забаронена, сюды ссылалі нязгодных, падазроных, «нязручных» свяшчэннікаў.

Сёння гэтыя мясціны — аграгарадок Імянін (старую, відаць, яшчэ татарскую назву Таракань у савецкі час прыбралі як непрыгожую). Ад самога храма захаваўся толькі кавалак сцяны, затое яшчэ стаяць келлі, манастырская кухня, свірны, дзе з-пад шыферу прабіваецца гонта старога даху. А пад зямлёй чакаюць вяртання, вывучэння і служэння людзям падзямеллі (агульнай працягласцю каля 500 метраў), у тым ліку пабудова з белага граніту, падобная на падземную капліцу. Манастыр

# ПАЛЕШУКОЎ,

## Брэсцкае Палессе

быў узарваны ў 1960-я гады, сутарэнні, якія вабілі мясцовую моладзь (тут нават гулялі ў тайныя таварыствы, куды прымалі пасля пэўных абрадаў і выпрабаванняў крапівай), закідалі бітай цэглай. Дырэктар ваенна-гістарычнага музея імя Удовікава Сяргей Гранік, які водзіць экскурсіі па Драгічынскім раёне, заўважыў, што вышыня падзямелляў — 2,7 метра. Ён паведаміў, што захаваліся і незвычайныя іконы з храма: іх аўтары ачалавечвалі святых, маглі намаляваць апошніх з рубанкам ці сякерай. На Брэстчыне была выдатная іканапісная школа. Сяргей Уладзіміравіч нават ездзіў з вучонымі НАН у экспедыцыі, каб больш высветліць пра мясцовы царкоўны жывапіс. Многія старыя абразы, якія не падыходзяць пад каноны, у цэрквах аказаліся незапатрабаваныя, шмат што было знішчана — перамалявана, сапсавана і нават спалена. Так, яшчэ дзесяць гадоў таму ў адной з цэркваў проста на двор вынеслі ўсё «непатрэбнае», у тым ліку іконы і кнігі. «Па сутнасці, так знішчылі частку нашага мінулага, гісторыі, бо храмы вялі хроніку», — шкадуе Сяргей Уладзіміравіч.

Манастырскі сад Тараканскага манастыра быў самы вялікі ў ВКЛ, былі сажалкі і арашэнне. Калі храм зачынілі, князі Дольскія некалькі гадоў вывозілі адсюль усё, што толькі было магчыма. Частка велічнага парку дайшла да нас — праўда, сёння яна хутчэй нагадвае непраходныя джунглі.





## СТРАЧАНАЯ СПАДЧЫНА

Некалі на тэрыторыі Драгічынскага раёна было 82 сядзібы. У XIX—XX стагоддзях гэтая багатая спадчына была знішчана, захаваліся толькі фрагменты. Адзін з такіх старасвецкіх куткоў — вёска Пярковічы. Тут захаваліся царква, пабудаваная Віславухамі, і сядзібны дом, у якім цяпер месціцца санаторная школа. Зянон Казімір Віславух быў суаўтарам Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1791 года (першай у Еўропе і другой у свеце). Аўтары Канстытуцыі далі абяцанне пабудаваць храм у Варшаве, але падзелы Рэчы Паспалітай не дазволілі тое зрабіць, і тады Зянон вырашыў паставіць храм хоць бы ў сваім маёнтку. Адначасова з царквой будаваўся і сядзібны дом на 15 пакояў. «Тут род Віславухаў жыў прыкладна 160 гадоў. Будынак адрэстаўрыраваны ў пачатку 2000-х, тады яму былі вернутыя калоны, якія самі Віславухі загадалі прыбраць пасля няшчаснага здарэння. «Адзін з апошніх уладальнікаў, Антоній Віславух, быў заядлым бібліяфілам і вельмі адукаваным. Ён скончыў Варшаўскі універсітэт па спецыяльнасці гісторыка. Ведаў выдатна новыя і старыя мовы. У 1930-я выкладаў у Брэсце ў гімназіі латынь і грэчаскую мову. Расказвалі, быццам, у яго бібліятэцы быў экзэмпляр кнігі Каперніка, дзе той упершыню даказаў, што Зямля верціцца вакол Сонца. Царква гэтыя кнігі знішчала і таму такі экзэмпляр быў вельмі каштоўны. Была нібыта ў бібліятэцы Антонія і рэдкая Радзівілаўская Біблія, а таксама скрыня са старажытнымі рукапіснымі граматамі. І на сёння застаецца загадкай, куды ўсё знікла», — распавядае **мясцовы краязнавец, настаўнік гісторыі Яўген КВАЧУК**. Для мужчыны гэта яшчэ і сямейная гісторыя — яго продкі былі прыгоннымі Віславухаў, некалі пан сям'ю яго прадзедаў з вёскі Папіна выменяў на пару паляўнічых сабак...

Антоній Віславух ведаў шмат моў. Калі цыганскі табар праходзіў праз гэтыя мясціны, то на пэўны час спыняўся ў Віславухаў; і старыя цыганкі пыхкалі люлькамі і размаўлялі з панам прафесарам на незразумелай мясцовым сялянам мове. Апекаваліся Віславухі і над яўрэямі. Справа ў тым, што пасля паўстання 1863 года мясцовыя паны, якія былі яго ўдзельнікамі, маглі пацярпець, дом нават быў ачэплены казакамі, зранку павінен быў пачацца вобыск. Але ўначы мясцовы карчмар-яўрэй прабраўся ў дом і вынес дакументы з кампраматам.

## НОВАЯ СТАРАЯ ЖАМЧУЖЫНА

Ужо некалькі гадоў вядуцца рэстаўрацыйныя работы ў вёсцы Закозель. І да 2024 года мы зможам убачыць далікатную, аздобленую дзівоснай ляпнінай капліцу-пахавальню Ажэшкаў.

«Капліца пабудавана ў стылі англійскай неаготыкі. Гэта спалучэнне стыляў і матэрыялаў: фігурнае ліццё, фігурная ляпніна, цагляны мур, вітражнае шкленне. Дах быў пакрыты меддзю, але ў часы Першай сусветнай вайны немцы знялі меднае пакрыццё і звезлі ў Германію. З 1915 да 1923 года капліца стаяла без даху, а пасля яе ўладальнік Караль Талочка пакрыў будынак цынкавымі лістамі. У бажніцах стаялі статуі ў чалавечы рост (фігуры апосталаў цяпер можна ўбачыць у Пінску). Чатыры статуі размяшчаліся і ўнутры, былі хоры, алтар з мармуровай плітой», — распавёў **інжынер-рэстаўратар Сяргей КРУК**.

Наогул, Закозелле вартае асаблівай увагі яшчэ і ў сувязі з Элізай



Ажэшкай ды іншымі прадстаўнікамі роду. Тут захаваліся старажытны парк, бровар і двухпавярховы будынак ці то свірна, ці то стайні. Вяртанне дадзенага архітэктурнага помніка — сапраўды важная культурная падзея.

## ПАГЛЫБЛЕННЕ

Брэсцкае Палессе не варта наведваць наскокам, інакш вы можаце проста прайсці міма яго галоўных таямніц. У маленькіх вёсачках вас чакае столькі адкрыццяў! У палешукоў можна «завіснуць» на некалькі дзён, і ў кожны з іх вы будзеце адкрываць





для сябе Беларусь з нечаканых ракурсаў.

Музейны комплекс Напалеона Орды ў Варацэвічах Іванаўскага раёна можа сустрэць вас музыкай гэтага кампазітара. «Наша музейная ўстанова высокага інтэлекту. Мы не хацелі б, каб ад нас пахла піражкамі і пончыкамі. Мы хочам, каб ад нас патыхала мастацтвам і тымі высокімі ідэаламі, якімі жыло чалавецтва ў часы Напалеона Орды, — заўважае **навуковы супрацоўнік музея Ларыса ДРЫЧЫЦ**. — Напалеон Орда аб'ездзіў свет. Сярод яго сяброў былі асобы, вядомыя ў сусветнай культуры: Станіслаў Манюшка, Фрыдэрык Шапэн, Адам Міцкевіч, Іван Тургенеў, Ферэнц Ліст, Ян Чачот, Жорж Санд, Паліна Віярдо, Джузэппэ Вердзі і іншыя. Але яго асоба не была незаўважная ў такім атачэнні, невыпадкова ён быў дырэктарам Італьянскай оперы ў Парыжы. Пасля паўстанняў 1830—1831 і 1863 года Напалеон атрымлівае статус дзяржзлачынцы. На яго прыходзіць данос, што ён ноч у ноч чэрціць планы крэпасцяў і дасылае за мяжу, яго вінавацяць у шпіянажы. Але прыходзіць адказ пінскага спраўніка мінскаму губернатару, што факт правераны: Орда сапраўды чэрціць планы крэпасцяў, але не на шкоду Радзіме, а ў славу яе. Чалавека трэба падтрымаць. Тым не менш, 15 месяцаў кобрынскай турмы мастаку былі забяспечаныя... Расказваць пра гэту асобу можна багата, але галоўнае, што праз яго імя мы здольныя паказаць, як можна жыць дастойна і што можна рабіць для роднага краю».

Варацэвіцкі музей выдатна ўпісваецца ў любыя турмаршруты, па дарозе сюды (і адсюль) можна ўбачыць мясціны, якія замаляваў Напалеон Орда і захаваў для нас такімі, якія яны былі ў XIX стагоддзі. І хоць гэты чалавек пакінуў свету найбагацейшую спадчыну (выявы 1098 матэрыяльных аб'ектаў розных краін Еўропы, 50 музычных твораў), яшчэ гадоў з дваццаць таму нават на яго малой радзіме пра мастака і кампазітара ніхто не ведаў. А сёння вяртаецца не толькі яго імя, але і яго эпоха — у музейны комплекс едуць маладыя, каб зладзіць вяселле з касцюмамі і музыкай таго часу; Масленіцу ці Новы год тут сустракаюць так, як гэта магло быць пры Напалеоне Ордзе. Дзеці, што прыходзяць на музейныя заняткі, ведаюць, як раней адзяваліся, у што гулялі. Лекцыі, квэсты, музычныя і тэматычныя вечарыны, выстаўкі і пленэры — усё робіцца для таго, каб кожны госць паглыбіўся ў шляхетную культуру, адчуў новыя сэнсы і адценні спадчыны. Супрацоўнікі музея не раз выступалі з прапановамі да Мінадукацыі ўключыць наведванне музеяў у школьную праграму. «Такія ўстановы трэба выкарыстоўваць як патэнцыял для выхавання асобы!» — перакананая Галіна Георгіеўна.

## ПА ЗДАРОЎЕ

Усе прызвычаіліся, што Беларусь — краіна замкаў, рэк, азёраў і балот, а ці задумваўся хто, што гэта яшчэ і краіна зёлак. Стагоддзямі тут перадаваліся народныя рэцэпты, мясцовыя расліны ратавалі людзей ад хвароб, бабулькі нашэптвалі над малымі замовы, складаліся паданні пра расліны.

«Наша хата здароўем багата» — так вітаюць гасцей у вёсцы Стрэльна ў філіяле традыцыйнай культуры «Дом траўніка» Мотальскага музея народнай творчасці. Тут сустракаюць з кошыкам зёлак, дзеляцца народнымі рэцэптамі, частуюць настоямі з зёлак, даюць парады, што і як нарыхтоўваць альбо што карыснага пасадзіць у сваім садзе-агародзе. Зёлкаваму музею сёлета спаўняецца ўжо трыццаць гадоў! І ўвесь гэты час сабраныя ад бабулек традыцыйныя рэцэпты стараюцца данесці да людзей. Апошнія гады наладжана актыўнае супрацоўніцтва з Нацыянальнай акадэміяй навук, дзякуючы чаму карысныя веды стануць яшчэ больш даступныя, трапяць у работы вучоных, кнігі. У вясенне-восеньскі перыяд у Стрэльне стараюцца нарыхтоўваць зёлкі і чакаюць тых, хто гатовы далучыцца да гэтай справы. А яшчэ тут вас з радасцю сустрэнуць на Шчадроўках, Калядках і іншых народных святах.

Так, Іванаўшчына заваблівае вясковымі музейчыкамі, знаёміць з народнымі рамёствамі, зараджае пазітыўным настроем на фестывалях, і радуе кулінарным майстэрствам месцічаў. Ужо ў жніўні вас чакаюць Мотальскія прысмакі!

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «+30. Жаркий сезон призов!»

Настоящие правила проведения рекламной игры «+30. Жаркий сезон призов!» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «+30. Жаркий сезон призов!» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 7-й этаж, к. 25, пом. 701, УНП 190771520, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 02.11.2006 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190771520.

**2. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются физические лица, держатели банковских платежных карточек международной платежной системы Visa, эмитированных ОАО «Белагропромбанк» (далее – Карточка).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**3. Наименование Рекламной игры:** «+30. Жаркий сезон призов!».

**4. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**5. Срок начала Рекламной игры:** 7 августа 2021 года.

**6. Срок окончания Рекламной игры:** 30 декабря 2021 года.

**7. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования заключения договоров текущего (расчетного) банковского счета, к которому выпускается Карточка (далее – Договор), а также безналичных расчетов физическими лицами с использованием Карточек.

**7.1.** В настоящих Правилах термин **«Карточка»** используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

**8. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора в размере **81 649,29 (Восемьдесят одна тысяча шестьсот сорок девять) белорусских рублей 29 копеек.** Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

**Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.**

| № | Наименование | Название приза далее в Правилах | Кол-во, шт. | Стоимость за ед., бел. рублей | Всего, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз 30 000 белорусских рублей | Главный приз | 1 | 30 000,00 | 30 000,00 |
| | Денежные средства в размере | | | 4 460,34 | 4 460,34 |
| 2 | Электросамокат Hoverbot MV-02/ HVBTMV2 | Электросамокат | 9 | 999,00 | 8 991,00 |
| | Денежные средства в размере | | | 126,86 | 1 141,74 |
| 3 | Мобильный кондиционер Ballu BPAC-09 CE | Кондиционер | 9 | 858,00 | 7 722,00 |
| | Денежные средства в размере | | | 105,79 | 952,11 |
| 4 | Гамак Gamak.by BB392K без брусков (морковный) | Гамак | 30 | 297,00 | 8 910,00 |
| | Денежные средства в размере | | | 21,97 | 659,10 |
| 5 | Кружка термическая метал., 300 мл. «Elite» упак., черный | Термокружка | 100 | 40,20 | 4 020,00 |
| 6 | Сумка пляжная «Sylt» полиэстер., синий/белый | Пляжная сумка | 100 | 20,70 | 2 070,00 |
| 7 | Рюкзак д/ноутбука 15" «Glaze» полиэстер, серый | Рюкзак для ноутбука | 90 | 54,30 | 4 887,00 |
| 8 | Полотенце махровое 70*140 см «Guten Morgen Хоум» х/б, белый | Полотенца | 80 | 25,80 | 2 064,00 |
| | Полотенце махровое «Guten Morgen Премиум» 30*50 см ПМтс-30-50 х/б т.-синий | | 80 | 10,20 | 816,00 |
